

БЕЛАРУСКІЯ СЦЭНАРЫІ «АДПАЧЫНКУ-2021» 5

ВЯРТАННЕ «РЭШТКАЎ МІНУЎШЧЫНЫ І ЦЫВІЛІЗАЦЫІ» 12





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 КРАСАВІКА 2021 г. АЎТОРАК № 78 (29447)


## КОРАТКА

• Савет па развіцці прадпрымальніцтва змяняе свой статус з кансультатыўнага органа пры Прэзідэнце Беларусі на кансультатыўны орган пры Савеце Міністраў. Адпаведны ўказ № 163 кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 красавіка.

• **Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў тэрміны правядзення XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» — з 15 да 18 ліпеня.**

• У пункце пропуску «Новая Гута» ў ліпені пачнецца эксперымент па абавязковай дэзынфекцыі транспарту.

• **У Мінску разгледзяць пытанне аб забароне праезду фур па МКАД.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«У Беларусі больш за 23 тысячы населеных пунктаў, з якіх газіфікавана каля 3,5 тысячы. Работы па газіфікацыі будуць працягвацца нароўні з электрыфікацыяй жыллёвага фонду. Гэтыя два кірункі будуць адзін аднаго дапаўняць і працаваць на выкананне ключавой задачы — павышэнне якасці жыцця людзей. Зацверджаны адпаведныя праграмы на пяцігодку — па павелічэнні электраспажывання для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння і па развіцці арганізацый газавай сферы. У аснове іх рэалізацыі — зладжаная і скаардынаваная работа энергетыкаў і газавікоў».*

З першых вуснаў

# «Тут будуць жыць людзі і будуць жыць добра. Мы для гэтага зробім максімум»

### Сёлета па загадзе Прэзідэнта распрацуюць комплексную праграму адраджэння чарнобыльскіх зямель да ўзроўню, які быў да аварыі

**Сярод рабочых паездак па краіне Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ёсць традыцыйныя. Некаторыя з візітаў святочныя (напрыклад, адкрыццё форумаў «Александрыя збірае сяброў», «Славянскі базар у Віцебску»), а іншыя прымеркаваны да сумных дат. Такой з'яўляецца 26 красавіка. Менавіта ў гэты дзень 1986 года былі перавернуты лёсы многіх людзей і нават цэлых пакаленняў. Аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі ў 1986 годзе стала сапраўднай катастрофай для дзяржавы, а некаторыя нават сцвярджаюць, што і адной з перадумоў для развалу СССР.**

**Сёлета Беларусь успамінае аварыю на ЧАЭС асабліва — прайшло ўжо 35 гадоў. Цяперашняя камандзіроўка Прэзідэнта ў раёны, пацярпелыя ад катастрофы на ЧАЭС, пачалася ў суботу ў Нараўлянскай частцы Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Там Аляксандр Лукашэнка наведаў былы населены пункт Цешкаў, дзе заснавана пчаліная пасека. Дзякуючы добрай арганізацыі працы пчаляры атрымліваюць чысты мёд нават ва ўмовах радыеактыўнага забруджвання. Прэзідэнт пагутарыў з майстрамі, якія займаюцца народнымі промысламі — лозапляценнем, саломапляценнем, разьбой па дрэве, наведаў конеферму і азнаёміўся з гадоўляй племянных коней.**

**Учора візіт па пацярпелых ад аварыі рэгіёнах прадоўжыўся ў Брагіне. Кіраўнік краіны паўдзельнічаў у высадцы вастралістых клёнаў для алеі гарадскога парку і ў мітынгу-рэквіеме. Пасля мемарыяльных мерапрыемстваў у райвыканкаме правялі нараду па адраджэнні чарнобыльскіх зямель.**

СТАР. 2



Фота БелТА.





Лічбавізацыя

# АНЛАЙН-УЗАЕМАДЗЕЯННЕ: ДЗЯРЖАВА, ГРАМАДЗЯНЕ, БІЗНЕС

### Электронны ўрад Беларусі, ID-карткі і кабінет карыстальніка

**Прэзентацыя дасягненняў і праектаў у галіне электроннага ўрада, пошук новых шляхоў лічбавізацыі і ўзаемадзеяння дзяржавы, бізнесу і грамадзян праз інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі — такія адмысловыя задачы ставіць на мэце Першы міжнародны форум #GBC (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне), які адбудзецца ў Мінску 28—29 красавіка. Летась у Беларусі было аказана больш як 6,5 млн электронных паслуг. Грамадзяне могуць падаваць заявы праз інтэрнэт на здзяйсненне 60 адміністрацыйных працэдур, пералік якіх у хуткім часе павялічыцца яшчэ на 16 пазіцый. А з 1 верасня ў краіне павінны запрацаваць восем біяметрычных дакументаў. Падрабязней пра асаблівасці арганізацыі форуму і пра што на ім можна даведацца, расказалі эксперты.**

### ЖЫЦЦЁ Ў ВОБЛАЧНЫХ ТЭХНАЛОГІЯХ — УЖО РЭАЛЬНАСЦЬ

Асноўная задача мерапрыемства — расказаць грамадзянам і бізнесу, як сёння ў Беларусі выглядае электронны ўрад, і выбудаваць з удзельнікамі форуму дыялог наконт таго, як улада бачыць далейшае развіццё гэтага працэсу, акрэсліў **Сяргей РУДНЕЎ, першы намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг (НЦЭП):**

— Ужо сёння электронны ўрад функцыянуе на поўную моц. Пры гэтым штодня мы атрымліваем новыя выклікі па забеспячэнні камфортнага атрымання дзяржаўных паслуг і адміністрацыйных працэдур ад дзяржавы для грамадзян і ад дзяржавы для бізнесу. І статыстыка пацвярджае, што запатрабаванасць грамадзян і бізнесу ў атрыманні паслуг ад дзяржавы штогод узрастае, і наша асноўная задача ў будучыні — максімальна перавесці ў анлайн-узаемадзеянне дзяржаву, бізнес і грамадзян.



СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

21078

9 771990 763008

# «Тут будуць жыць людзі і будуць жыць добра. Мы для гэтага зробім максімум»

## «НЕЛЬГА КІДАЦЬ ГЭТЫЯ ЗЕМЛІ»

Прыбыўшы ў Брагін, Прэзідэнт заявіў, што добраўпарадкаванне такіх пасёлкаў неабходна весці па прыкладзе аграгарадка Копысь. То-бок правесці дарогу, абапал якой тэрыторыю разбіць на ўчасткі. На іх людзі могуць пабудаваць уласныя сядзібы, а некаторыя з пляцовак варта адвесці пад шматкватэрныя дамы.

«Вось гэта такі добры вопыт прывядзення ў парадак не толькі пасёлкаў, але і раённых цэнтраў. Такім чынам можна і ў аграгарадках, і ў буйных гарадах весці забудову», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён упэўнены, што калі грунтоўна падысці да гэтага пытання (стварыць пад'язныя шляхі, інфраструктуру), то падобныя ўчасткі будуць запатрабаваны.

«У Брагіне гэта адназначна трэба рабіць. Для такога пасёлка, як Брагін, ідэальна: цэнтр ёсць, куды людзі могуць прыйсці заняцца спортам. Хаткі акуратныя, прыведзены ў парадак. Трэба падтрымаць вось гэтыя нашы 5-6 паўднёвых раёнаў. ***Нельга кідаць гэтыя землі. Як гэтыя землі абараняць, калі тут людзей не будзе? Трэба добраўпарадкоўваць такія пасёлкі, раённыя цэнтры і аграгарадкі»,*** — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт заявіў, што побач з Брагінам плануюць пабудаваць электрастанцыю на сонечнай энергіі. «Газ, нафта — задавальненне не таннае і чужое, а мясцовых відаў паліва дастаткова. Плюс электрычнасць неабходна падводзіць», — канстатаваў кіраўнік краіны. Ён адзначыў, што псіхалогію стаўлення да вёсак неабходна змяняць — людзі больш будуць імкнуцца жыць у аграгарадках і раённых цэнтрах.

Высаджваючы алею, Прэзідэнт пагутарыў з мясцовай моладдзю. Была ўзнята тэма развіцця і падтрымкі аматарскага спорту ў невялікіх гарадах і населеных пунктах. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў важнасць гэтага кірунку, назваўшы яго адной з асноў ідэалагічнай работы.



Фота БелТА.

## Жыхары — пра свой край

**Якім чынам за апошнія гады змянілася жыццё ў рэгіёне, у брагінцаў запытала карэспандэнт «Звязды».**

*«Калі казаць пра змены ў Брагіне, трэба перадусім казаць пра змены ў свядомасці людзей. Пачынаючы жыццё пасля чарнобыльскай аварыі, мы вучыліся жыць па новых правілах. Будаваць новы Брагін прыйшлося амаль на разбураных землях, бо адсюль з'ехалі людзі. Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы і палітыцы, што вялася ў адносінах да чарнобыльскіх рэгіёнаў, адчувалі: мы не адны. Нашы дзеці аздараўліваюцца ў санаторыях, вучацца ў выдатнай школе, займаюцца ў дашкольных установах. Для іх створаны ўмовы: дзіцячая школа мастацтваў, бібліятэкі, выдатны спартыўны цэнтр. Людзі навучыліся жыць, гаспадарыць ва ўмовах чарнобыльскай небяспекі на гэтай зямлі і абараняць сябе ад нябачнага ворага»,* — сцвярджае Галіна ШАЎЧЭНКА.

*«Адсюль я нікуды не з'язджала, мае дзеці выраслі тут. Сын тут працуе. Горад з часам стаў прыгажэць. Нам нават прысуджаюць рэспубліканскія прэміі па добраўпарадкаванні. Жывецца зараз тут камфортна, развіваецца гандлёвая сетка. З часам мы пачынаем забываць пра цяжар аварыі. Штодня мы радуемся жыццю, прыродзе нашага краю. Нават мае аднакласнікі, якіх жыццё раскідала па розных кутках Савецкага Саюза, з задавальненнем сюды прыязджаюць і кажуць: «Лепшага за наш Брагін гарадка няма»,* — кажа Ала КУЧЫК, жыхарка г. п. Брагін.

## ВЯРТАЛІ ДА ЖЫЦЦЯ ГЕКТАР ЗА ГЕКТАРАМ

Пасля работы ў гарадскім парку Прэзідэнт накіраваўся на цэнтральную плошчу, дзе быў арганізаваны мітынг-рэквіем. Кіраўнік дзяржавы выступіў перад мясцовымі жыхарамі з прамовай.

«Чарнобыльскую аварыю прызналі самай маштабнай тэхнагеннай катастрофай у гісторыі чалавецтва. Яе наступствы закранулі больш як два дзясяткі краін, але асноўны ўдар прыйшоўся на Беларусь. І сёння, праз 35 гадоў з дня трагедыі, мы сабраліся тут, прыблізна за 46 кіламетраў ад ачага выбуху, каб ушанаваць памяць герояў, якія ратавалі ад яшчэ больш шай катастрофы гэты еўрапейскі рэгіён», — сказаў кіраўнік краіны.

Мітынг прайшоў на цэнтральнай плошчы пасёлка. Побач — архітэктурная кампазіцыя, прысвечаная адселеным вёскам раёна, і помнік ліквідатару, ураджэнцу Брагіншчыны Васілю Ігнаценку. Гераічнаму подзвігу старшага сяржанта Аляксандр Лукашэнка ўдзяліў у выступленні асаблівую ўвагу.

Па яго словах, Васіль Ігнаценка ўвайшоў у гісторыю як камандзір, які паказаў асабісты прыклад мужнасці і адвагі пры выкананні складанай баявой задачы, як моцны духам чалавек, які, нягледзячы на атрыманыя апёкі, ратаваў сваіх таварышаў. Прэзідэнт адзначыў, што дзякуючы зладжаным дзеянням атрада пажар на даху 4-га энергаблока атамнай станцыі быў цалкам ліквідаваны. Нашаму земляку пасмяротна прысвоена званне Героя Украіны.

«Успамінаючы Васіля Ігнаценку, мы аддаём даніну памяці подзвігу пажарных, ваенных, медыкаў, навуковых і тэхнічных супрацоўнікаў станцыі. Тых, хто цаной свайго жыцця змагаўся з агнём, аказваў першую дапамогу на месцы аварыі і ўзводзіў ахоўны саркафаг. Сярод ліквідатараў аварыі на ЧАЭС — 115 тысяч беларусаў. ***Не мы будавалі станцыю, не мы яе эксплуатавалі, не па нашай віне адбылася гэта катастрофа. Але на нас выпала значная колькасць радыяцыйных ападкаў. Фактычна мы сабой закрылі гэту страшэнную бяду»,*** — акцэнтаваў Прэзідэнт.

Ён працягнуў: подзвіг герояў-чарнобыльцаў уразіў свет, і справа нават не ў тым, што гэтыя людзі працавалі на мяжы сваіх магчымасцяў і зрабілі ўсё, каб мінімізаваць пагрозу, а ў тым, што яны свядома ахвяравалі сабой у імя жыцця іншых.

«Яны ведалі, што працаваць прыйдзецца ва ўмовах смяротнага ўздзеяння радыяцыі, што вялікая рызыка чарговага выбуху, і тым не менш ішлі на аб'ект і выконвалі свой абавязак. Без сумневаў і страху, у адзіным страі, падстаўляючы адзін аднаму плячо, так, як заўсёды гэта рабілі савецкія людзі, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Калі б не мужнасць, адданасць абавязку і самаадданасць ліквідатараў чарнобыльскай аварыі, маштабы трагедыі былі б значна большыя. Подзвіг герояў, якія аддалі жыццё за бяспечную будучыню людзей Зямлі, мы не павінны забываць ніколі».

Па словах кіраўніка краіны, чарнобыльская аварыя змяніла лёсы мільёнаў, а для беларускага народа стала нацыянальным экалагічным, эканамічным і сацыяльным бедствам. У мірны час мы даведаліся, што такое боль страты роднай зямлі: спынілася жыццё амаль у паўтысячы населеных пунктаў, больш за 300 тысяч чалавек страцілі свае дамы.

«Вы ведаеце, што з-за мяжы і нашы «дамарослыя» (таты, маці і дзядулі тых, хто сёння хадзіў па вуліцах) нам раілі зачыніць гэтую частку краіны на замок. Увесь поўдзень да Прыпяці адрэзаць і закрыць! ***Але чарнобыльскі ўдар, наадварот, згуртаваў беларусаў у імкненні захаваць гэты край, зрабіў нас мацней. Мы ўспомнілі ўрок, які дадзены ў спадчыну нашымі бацькамі і дзядамі: ніколі не здавацца і не ўставаць на калені»,*** — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падзяліўся з брагінцамі, што кожную вясну ў гэтыя памятныя дні ён заўсёды тут, у пацярпелых рэгіёнах, а чарнобыльская бяда прыйшлася і па яго лёсе. Самым цяжкім для яго ў пачатку прэзідэнцкай працы было прыняць рашэнне: гэтыя землі не пакінуць.

«Тады гэта рашэнне было няпростым, але мне яго прыйшлося прыняць. Няшмат, шчыра кажучы, у маім жыцці было такіх радыкальных рашэнняў. Правільна ці не мы паступілі тады — вам судзіць. ***Мы будзем рабіць усё, каб населеныя пункты былі ў такім добрым стане.*** Вы малайцы, у 2018 годзе вы папрацавалі і прывялі ў парадак свой гарадок. Далей неабходна развівацца ад цэнтра. Аб гэтым мы толькі што гаварылі з кіраўніцтвам вобласці, вашага і суседніх раёнаў. ***Тут будуць жыць людзі і будуць жыць добра. Мы для гэтага зробім максімум»,*** — паабяцаў Прэзідэнт.

Сёння ў адраджэнні пацярпелых рэгіёнаў — трэці этап, працягнуў кіраўнік краіны. За гэты час неабходна стварыць праграму, па якой землі атрымаюць сур'ёзнае развіццё, каб людзі разумелі: дзе і як яны будуць жыць, працаваць.

***«Час выбраў нас, каб адрадзіць гэтыя землі. І вы ведаеце, што развіццё рэгіёна, стварэнне ўмоў для жыцця і працы людзей увесь гэты час у мяне на кантролі.*** Нават у жабрацкія 90-я гады мы знаходзілі грошы на дапамогу пацярпелым людзям, на аздараўленне і будаўніцтва новых дамоў для адсялення, на навуковыя даследаванні і ўзвядзенне спецыялізаваных медыцынскіх цэнтраў, на аднаўленне.

«Адраджаючы жамчужыну нашай Беларусі — Палессе, мой любімы край, мы з вамі дасягнулі вялікіх поспехаў. Але трэба будзе зрабіць яшчэ больш. Я цвёрда ведаю, што разам мы зможам гэтыя задачы вырашыць, ***мы зробім усё, каб у найбліжэйшай будучыні след тэхнагеннай катастрофы застаўся толькі ў гістарычных хроніках і памяці аб героях-ліквідатарах»,*** — звярнуў увагу кіраўнік краіны.

Ён задаў пытанне: ці будуць дзеці нашых дзяцей так востра адчуваць гэтыя праблемы? «Як паказалі падзеі канца мінулага года — не ўсе. Таму, калі мы не вырашым чарнобыльскую праблему на працягу пяці гадоў, не вызначымся, што будзем рабіць у будучыні на гэтых землях, ніхто не вырашыць гэтую праблему. Боль пройдзе, з нашых лёсаў сыдзе Чарнобыль. Ці застанецца ў жыццях, сэрцах і лёсах нашых дзяцей і ўнукаў гэты боль, цяжка сказаць. ***Чаго б нам ні каштавала, мы павінны зрабіць усё, каб, аднавіўшы гэтыя землі, удыхнуць у іх сапраўднае жыццё.*** Вось мэта майго прыезду ў гэтую вясну ў чарнобыльскія рэгіёны», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Пасля завяршэння прамовы Прэзідэнт пагаварыў з мясцовымі жыхарамі, звярнуўшыся да некаторых надзённых праблем. У прыватнасці, старшыні райвыканкама была пастаўлена задача прышчапіць усіх людзей ад 60 гадоў і тых, хто мае значныя праблемы са здароўем, ад каранавіруса.

## РЭНЕСАНС ПАЛЕССЯ

Пасля мітынгу Аляксандр Лукашэнка накіраваўся ў райвыканкам. Там правялі невялікую нараду, якую спачатку не заяўлялі ў парадак дня. Запрасілі абмеркаваць завяршальную праграму адраджэння зямель усіх старшыняў райвыканкамаў чарнобыльскіх раёнаў. Прэзідэнт растлумачыў, чаму менавіта зараз наспела такая магчымасць. «Мы пражылі 35 гадоў пасля чарнобыльскай катастрофы і на практыцы зразумелі, якім шляхам нам неабходна аднаўляць жыццё», — сказаў кіраўнік краіны.

***«Землі гэтыя трэба аднавіць. І павінна быць праграма адраджэння зямель, мэтай якой павінна стаць аднаўленне да таго ўзроўню, як было да Чарнобыля з некаторымі асаблівасцямі.*** Ны ў тым, што на землях Прыпяцкага радыяцыйнага запаведніка і на землях Гомельскай вобласці маленькія вёсачкі мы не адновім. Іх і не трэба аднаўляць. Але калі хтосьці захоча на землі, дзе была вёска, прыйсці і там пабудаваць сядзібу, мы гэтаму перашкаджаць не будзем. Нам не да гэтага. Нам трэба вызначыцца, дзе будуць жыць людзі, — а гэта раённыя цэнтры і аграгарадкі», — дадаў Прэзідэнт.

У такіх населеных пунктах, на яго думку, будзе заснавана сельскагаспадарчая вытворчасць, лесаперапрацоўчыя прадпрыемствы для першаснай работы з драўнінай.

Прэзідэнт расказаў аб ідэі вярнуцца да плана з Жыткавічаў кінуць да Ельска чыгунку, закальцаваць шлях. «Ну і іншыя дарогі трэба падцягваць. Словам, трэба аднаўляць раён, вызначыцца, дзе будуць жыць людзі. Мы павінны разумець, якія прадпрыемствы там пабудаваць, якія будуць працоўныя месцы», — мяркуе Аляксандр Лукашэнка. Адпаведную праграму пастаўлена задача выпрацаваць да верасня.

**Марыя ДАДАЛКА,**
*г. п. Брагін.*

## Патрабаванне комплекснага падыходу

Падчас суботняга візіту ў Нароўлю размова ў Прэзідэнта таксама ішла пра аднаўленне пацярпелых ад аварыі рэгіёнаў. За прыклад быў узяты вопыт, назапашаны ў Палескім радыяцыйна-экалагічным запаведніку. Там кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што на перспектыву важна разумець, дзе менавіта будуць жыць людзі ў пацярпелых рэгіёнах. Адпаведна, вакол буйных населеных пунктаў і саміх райцэнтраў варта ў першую чаргу планаваць развіццё тых ці іншых кірункаў эканамічнай дзейнасці, стварэнне працоўных месцаў. Гэта не толькі сельская гаспадарка, але і лясная галіна, турызм, невялікія вытворчасці і іншыя сферы. Напрыклад, у рэгіёне адкрываюцца новыя радовішчы карысных выкапняў.

Аляксандр Лукашэнка патрабуе комплекснага падыходу і даручыў усё дадатковa прадумаць і прапісаць у адпаведнай новай праграме, аналагічнай той, якая раней была прынята ў дачыненні да паўднёвага ўсходу Магілёўскай вобласці. Асаблівы акцэнт ён зрабіў на развіццё лясной гаспадаркі, уключаючы лесааднаўленне, лесанарыхтоўкі, перапрацоўку. Ён падкрэсліў, што дзяржава не кінула гэтыя землі, многае зроблена, але патрэбны большы вынік, дадаўшы, што трэба зрабіць максімум за бягучую пяцігодку.

Адказваючы на пытанні журналістаў, кіраўнік краіны падзяліўся сваім бачаннем рэалізацыі праграмы — праз канкрэтныя праграмы і інвестыцыі. «За лета мы створым праграму і будзем бачыць, што трэба ў Нароўлі, што — у Брагіне, што — у Хойніках. Гэта тры асноўныя раёны», — сказаў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што гэта будзе трэці буйны крок у засваенні тэрыторый. «Ну не можам мы поўдзень Беларусі аддаць прыродзе. Мы павінны ад гэтай прыроды нешта атрымаць. Акуратна, не перагінаючы. Галоўнае, вядома, бяспека, каб людзі сябе адчувалі ў бяспецы, не баяліся. Мы на практыцы пераканаліся, што паступілі правільна, што не кінулі гэтыя землі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

# «Мы цяпер бачым, хто ёсць хто, і можам спакойна працаваць»

**Адзін з магчымых фарматаў работы журналістаў падчас камандзіровак Прэзідэнта Беларусі — размова з кіраўніком краіны, калі ён адказвае на пытанні карэспандэнтаў з нагоды актуальных падзей у краіне і свеце. Такая гутарка адбылася і падчас візіту ў Нараўлянскі раён у суботу.**

**Адно з першых пытанняў — наконт анансаванага тыдзень таму дэкрэта, які павінен стаць адным з найважнейшых рашэнняў за гады прэзідэнцтва.** Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што дакумент датычыцца выключна ўнутранай сітуацыі ў краіне і адкажа на пытанне: што будзе, калі апанентам улады ўдасца замах на Прэзідэнта?

«Скажыце, калі заўтра няма Прэзідэнта, вы гарантуеце, што ўсё будзе нармальна? Не. Таму на гэты выпадак я падпішу ў найбліжэйшыя дні дэкрэт, як будзе выбудавана ўлада ў Беларусі. Прэзідэнта застрэлілі — назаўтра Савет Бяспекі будзе надзелены паўнамоцтвамі. Трэба ўводзіць надзвычайнае становішча імгненна, аж да ваеннага, калі хтосьці на граніцы варухнецца. І Савет Бяспекі павінен прымаць рашэнне», — перадае словы Аляксандра Лукашэнкі яго прэс-служба.

**Чарговае пытанне — пра нядаўнія перагаворы ў Маскве з Уладзімірам Пуціным.** Па словах Аляксандра Лукашэнкі, адной з тэм было развіццё кааперацыі. «Мы ў канкрэтыку акунуліся. На аснове кааперацыі мы павінны ўдыхнуць у многія вытворчасці новае жыццё. У гэтым сутнасць інтэграцыі — апусціцца на зямлю і зрабіць тое, што нам сёння вельмі неабходна. Ніхто нас ніколі не падтрымае. Сведчанне таму — цяперашні час: санкцыі супраць іх, санкцыі супраць нас. І гэта толькі пачатак. Нас будуць душыць», — заявіў Прэзідэнт. Ён дадаў, што таксама абмяркоўвалася развіццё інтэграцыі, новыя саюзныя праграмы, цэны на вуглевадародную сыравіну — газ, нафту.

Аляксандр Лукашэнка таксама пракаментаваў некаторыя выказванні пра яго перамовы ў наступным плане, што Прэзідэнта, маўляў, «у кут загналі, дзявацца няма куды, і Расія паглынула». «Нават размовы пра гэта не ішло. І сёння ім (сапернікам дзеючай улады. — **«Зв».**) хочацца нас штурхнуць на гэты шлях, — падкрэсліў кіраўнік краіны. — Таму нам трэба дзейнічаць і не дапускаць памылак. Калі б я паехаў, як яны вяшчалі, прадаваць або здаваць Беларусь, — слухайце, гэта б ім падарунак быў. А нам гэта не трэба. Я ўжо колькі разоў казаў: я — першы Прэзідэнт нашай незалежнай Беларусі, нам пашчасціла з вамі пабудаваць першую незалежную дзяржаву. Які Лукашэнка можа пайсці супраць гэтага і разбурыць яе ці камусьці здаць, ці кудысьці ўнутр далучыць?!»

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што на перагаворах не вяліся размовы і пра вайсковыя базы. «Навошта ў Беларусі ствараць базу, калі яна ў Смаленску — тры хвіліны палёту да таго ж Бабруйска. Навошта марнаваць велізарныя грошы?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што ў Беларусі і Расіі іншая стратэгія ў рамках АДКБ: «Наша зона адказнасці — беларускай арміі — захад. Калі толькі супраць нас агрэсія, у нас дастаткова сіл для таго, каб стрымаць яе на першым часе, пакуль разгорнецца ў тыле Расія».

**Аляксандр Лукашэнка расказаў і некаторыя падрабязнасці няўдалай змовы з мэтай дзяржперавароту.** Паводле яго слоў, змоўшчыкі распрацоўвалі некалькі сцэнарыяў. Першапачаткова яны планавалі ліквідацыю Прэзідэнта на парадзе. Аднак уявіць рэалізацыю ў Беларусі такой задумы складана, таму яны адмовіліся ад першапачатковай ідэі. Затым разглядаўся напад на прэзідэнцкі картэж. Для гэтага мяцежнікамі нават былі закуплены і прывезены ў Беларусь гранатамёты. Ажыццявіць такі сцэнарый у іх бы таксама не атрымалася: у мэтах бяспекі аўтамабілі ў картэжы едуць на вялікай хуткасці, і верагоднасць трапіць у іх вельмі малая. Па трэцім сцэнарыі ўзброеныя людзі павінны былі напасці на загарадную рэзідэнцыю Прэзідэнта. На знішчэнне рэзідэнцыі разам з кіраўніком дзяржавы вылучалася $10 млн, а на снайпера — $1 млн. «Гэта мы бачылі даўно ўжо. Вы думаеце, мы гэтую аперацыю ў Маскве правялі ні з сяго ні з таго? Мы за імі сачылі, яны павінны былі прыехаць у Мінск і правесці гэтую аперацыю. Але як толькі выйшаў гэты фільм (расследаванне «Манкурты». — **«Зв».**), яны вушы прыціснулі: "Не, у Мінск не паедзем. Куды? У Маскву". Мы кантралявалі іх кожны крок», — перадае заяву Аляксандра Лукашэнкі яго прэс-служба.

Каментуючы развагі пра затрыманых змоўшчыкаў (маўляў, не выглядаюць яны забойцамі і мяцежнікамі), Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, вядома, яны не павінны былі асабіста здзяйсняць тэракт або знішчаць прадстаўнікоў улады. «Я ж ведаю Фядуту: здраднік. Ён жа быў у штабе цяперашняга Прэзідэнта. Яго ж Вячаслаў Францавіч Кебіч падкінуў мне ў штаб, каб ведаць, што ў мяне робіцца. А які ў мяне штаб? Усяго пяць чалавек было. І ён, седзячы каля мяне, інфармаваў каманду Кебіча. Ну вось такі ён чалавек», — распавёў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адзін важны нюанс: мяцежнікі разлічвалі з дапамогай арміі блакіраваць Мінск разам з сіламі АМАП, унутранымі войскамі, МУС і КДБ. Усе гэтыя структуры ўзброеныя, і калі б атрымалася сутыкнуць іх, то пачалася б «самая страшная і гарачая грамадзянская вайна, якую не мела ніводная краіна».

У змоўшчыкаў таксама былі планы адключыць энергасістэму Мінска. На гэты момант звярнуў увагу і Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін на нядаўніх перагаворах з беларускім калегам. Фактычна гэта азначае, што планавалася кібератака на краіну. Прэзідэнт паабяцаў, што ў найбліжэйшы час будуць апублікаваны новыя падрабязнасці справы.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў спісе беларускіх чыноўнікаў, якіх планавала інтэрнаваць новая ўлада, звыш 30 чалавек. «Вось іх палітыка. Не дай бог, прыйшлі б да ўлады. Іх нельга блізка да ўлады падпускаць. Дрэнна, што адбылося ў мінулым годзе, але без гэтага мы б іх не вылічылі і не ведалі. А так мы цяпер бачым, хто ёсць хто, і можам спакойна працаваць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

# Выпрабаванні — у наступным годзе

## Вядзецца распрацоўка айчыннай вакцыны супраць COVID-19

**У РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі працягваюць распрацоўваць айчынную вакцыну ад каранавіруса. У найбліжэйшы час тут плануецца пачаць даклінічныя выпрабаванні на жывёлах, паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя.**

— Сёння пад распрацоўку айчыннай вакцыны падключана шэсць нашых лабараторый, — расказаў **дырэктар РНПЦ Уладзімір ГАРБУНОЎ.** — З мэтай стварэння айчыннай вакцыны падрыхтавана спецыяльнае распараджэнне кіраўніка дзяржавы. Міністэрства аховы здароўя надае гэтай рабоце асаблівую ўвагу, прыцягнуты вядучыя спецыялісты сістэмы аховы здароўя, у першую чаргу супрацоўнікі РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, — адзначыў ён.

Па словах **загадчыцы лабараторыі дыягностыкі ВІЧ і спадарожных інфекцый РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Алены ГАСІЧ,** галоўная задача — вылучэнне штамаў. Для гэтага праводзіцца маніторынг усіх завазных варыянтаў віруса. У якасці кандыдатнага варыянта будзе падабраны штам, які дамінуе ў краіне ў дадзены час. Айчынная вакцына будзе эфектыўная ў незалежнасці ад штама COVID-19, які цыркулюе.

На цяперашні момант спецыялісты ўжо выбралі некалькі штамаў і перайшлі да наступнага этапу.

— У найбліжэйшы час мы падыдзем да стадыі імунізацыі жывёл. Яна зойме не менш за месяц, — адзначыў **Анатоль КРАСЬКО, загадчык лабараторыі біябяспекі.**

Паводле яго слоў, плануецца, што прататып вакцыны будзе атрыманы да восені. А клінічныя выпрабаванні правядуць у наступным годзе.

### Індыйскага штама ў Беларусі пакуль няма

Як расказалі спецыялісты РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, пакуль што ў нашай краіне не выяўлены індыйскі штам каранавіруса.

У РНПЦ арганізавана пастаянная сістэма маніторынгу распаўсюджвання варыянтаў віруса SARS-CoV-2, які муціруюць. Праводзіцца збор і даследаванне матэрыялу ад асоб, якія прыбылі на працягу апошніх 14 дзён з-за межаў Беларусі і якія маюць станоўчы ПЦР-тэст.

Улічваючы сталасць і прадукцыйнасць працэсу зменлівасці віруса, вырашальнае значэнне мае сістэма хуткага выяўлення новых варыянтаў. Для гэтага ў Беларусі адпрацавана методыка секвеніравання S-гена віруса, з якім звязаны асноўныя мутацыі, выяўленыя ў новых варыянтах (брытанскі, індыйскі, амерыканскі, японскі).

Спецыялісты адзначаюць, што па меры развіцця пандэміі COVID-19 узбуджальнік, вірус SARS-CoV-2, пастаянна эвалюцыянуе — гэта звычайны біялагічны працэс.

### Сертыфікат аб вакцынацыі для тых, хто выязджае

Міністэрства аховы здароўя прыняло рашэнне аб выдачы грамадзянам, якія прайшлі вакцынацыю супраць COVID-19, «Сертыфіката аб вакцынацыі».

У сувязі з тым што правілы міжнароднага рэгулявання і патрабаванні ў дачыненні да вакцынацыі яшчэ фарміруюцца, такі дакумент, магчыма, будзе неабходны грамадзянам Рэспублікі Беларусь для паездак за мяжу.

Сертыфікат выдаецца ў пункце правядзення вакцынацыі на платнай аснове па жаданні грамадзяніна, які плануе выезд за межы краіны на працягу года. У дакумент будзе занесена інфармацыя аб правядзенні прафілактычных прышчэпак супраць COVID-19, якая пацвярджае правядзенне вакцынацыі-1 і вакцынацыі-2.

У прыватнасці, у сертыфікаце будзе наступная інфармацыя: найменне арганізацыі аховы здароўя, дата нараджэння асобы, якая атрымала прафілактычныя прышчэпкі супраць COVID-19. Сертыфікат запаўняецца на рускай і англійскай мовах. Найменне вакцыны запаўняецца на рускай і англійскай мовах (у цяперашні час ужываюцца наступныя вакцыны: «Гам-Ковід-Вак», Расійская Федэрацыя / Gam-COVID-Vac, Russian Federation; «Гам-Ковід-Вак», Рэспубліка Беларусь / Gam-COVID-Vac, Belarus; вакцына супраць SARS-CoV-2 (клеткі Веро), інактываваная, КНР / SARS-CoV-2 Vaccine (Vero Cell), Inactivated, China).

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# ПАЦЯПЛЕЕ ТОЛЬКІ Ў МАІ?

**Такое не па-красавіцку халоднае надвор'е, лічы, на цэлы месяц адстае ад кліматычнай нормы. Сярэднясутачная тэмпература на 5—8 градусаў ніжэйшая за норму. А ў апалках — усё больш снег. Апошні раз у новым стагоддзі так холадна ў канцы красавіка было ў 2005 годзе. А цяплець пачне толькі ў апошнія дні месяца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Праўда, сёння будзе яшчэ холадна. Мокры снег з дажджом і ўдзень усяго толькі 4—10 цяпла. У сераду надвор'е пачне выпраўляцца, але пакуль нясмела. У гэты дзень атмасферны ціск пачне расці, таму аблокаў і ападкаў стане менш. Месцамі, пераважна па паўночным усходзе краіны, пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла, удзень — ад плюс 7 да плюс 14 градусаў вышэй за нуль.

І толькі ў чацвер сітуацыя з холадам у нашай краіне пачне мяняцца. З паўднёвага захаду Еўропы ў Беларусь стане паступаць больш цёплая паветраная маса, і тэмпературныя паказчыкі пачнуць набліжацца да кліматычнай нормы. У начныя гадзіны па поўначы, удзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны. Аднак уначы будзе яшчэ падмарожваць. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад мінус 2 да плюс 5 градусаў. Удзень будзе ўжо значна весялей — ад плюс 10 градусаў да 17 цяпла, а па паўднёвым захадзе краіны — на пару градусаў цяплей.

Сапраўднае красавіцкае надвор'е прыйдзе да нас у апошні дзень месяца. Так, у пятніцу паблізу паўночна-заходніх межаў з паўднёвага захаду Еўропы пройдзе цыклон, і Беларусь ненадоўга апынецца ў яго цёплай частцы. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, удзень у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 цяпла, удзень — ад плюс 8 па поўначы да 22 (!) градусаў цяпла па поўдні.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, на святочныя выхадныя (1 і 2 мая) у нашай краіне ўсталюецца ўмерана цёплае надвор'е. У суботу і ўначы на нядзелю месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны 2 мая пад уплывам атмасфернага фронту на большай частцы тэрыторыі краіны зноў пройдуць дажджы. Ужо добра, што не снег.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Нікол Пашынян сышоў у адстаўку з пасады прэм'ера Арменіі



Прэм'ер-міністр Арменіі заявіў у тэлезвароце, што сыходзіць у адстаўку са сваёй пасады, але працягне выконваць абавязкі да правядзення пазачарговых парламенцкіх выбараў. Ён таксама паведаміў, што кіруючая партыя «Грамадзянскі дагавор» возьме ўдзел у маючых адбыцца 20 чэрвеня датэрміновых парламенцкіх выбарах, а ён сам будзе вылучаны на пасаду прэм'ер-міністра Арменіі. Пашынян адзначыў, што «толькі народ шляхам сумленнага і справядлівага галасавання вырашыць будучыню краіны». Урад Арменіі сышоў у адстаўку ў поўным складзе. Паводле канстытуцыі, члены ўрада працягваюць выкананне сваіх абавязкаў да фарміравання новага кабінета.

### У Індыі памерлых ад ковіду спальваюць на вуліцах

У Індыі апошнім часам фіксуецца каля 350 тысяч новых выпадкаў заражэння штодня, кожныя чатыры хвіліны ў сталіцы краіны Дэлі ад ковіду паміраe адзін чалавек, паведаміла «Бі-бі-сі». Прэм'ер-міністр Нарэндра Модзі заявіў, што краіна знаходзіцца ў эпіцэнтры каранавіруснага шторму. Трупы памерлых ад ковіду людзей спальваюць прама на вуліцы з-за недахопу месцаў, адзначыла «Бі-бі-сі». У многіх шпіталях скончыліся ложкі і кісларод, таму медустановы не прымаюць пацыентаў. Агульная колькасць заражаных каранавірусам склала амаль 20 мільёнаў чалавек, па гэтым паказчыку Індыя займае другое месца пасля ЗША. «Мы былі ўпэўнены ў перамозе пасля паспяховай барацьбы з першай хваляй, але гэтая бура ўзрушыла нацыю», — заўважыў прэм'ер-міністр Індыі ў радыёзвароце да народа.

### «Зямля качэўнікаў» стала трыумфатарам «Оскара»

У Лос-Анджэлесе прайшла 93-я цырымонія ўручэння ўзнагарод Амерыканскай кінаакадэміі. Карціна «Зямля качэўнікаў» атрымала «Оскара» як найлепшы фільм, а яе рэжысёр Хлоя Чжаа ўзнагароджана залатой статуэткай за найлепшую рэжысуру. «Зямля качэўнікаў» распавядае гісторыю аўдавелай жанчыны, якая вырашыла жыць у фургоне, падарожнічаючы па Амерыцы. Фрэнсіс Макдорманд, якая сыграла галоўную гераіню, атрымала «Оскара» за найлепшую жаночую ролю. Такім чынам, «Зямля качэўнікаў», якая сабрала галоўныя ўзнагароды кінаакадэміі, стала галоўным трыумфатарам цырымоніі. «Оскара» за найлепшую мужчынскую ролю атрымаў 83-гадовы Энтані Хопкінс, які сыграў у фільме «Бацька».

# АНЛАЙН-УЗАЕМАДЗЕЯННЕ: ДЗЯРЖАВА, ГРАМАДЗЯНЕ, БІЗНЕС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Для Нацыянальнага цэнтра абмену трафікам як аднаго з арганізатараў мерапрыемства форум — гэта перш за ўсё сацыяльна значны праект. Лічбавізацыя, інфарматызацыя, воблачныя тэхналогіі — гэта сённяшнія рэаліі, у якіх мы жывём і якія трэба выкарыстоўваць, вывучаць і ўкараняць ва ўсіх сферах жыцця, падкрэсліла **Таццяна ТУРОМША, намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях Нацыянальнага цэнтра абмену трафікам.**

*— Форум #GBC мусіць стаць пэўнай дыялогавай пляцоўкай, дзе будзе абмяркоўвацца лічбавае развіццё краіны. Важны аспект форуму — ён будзе праходзіць у тым ліку анлайн, і любы жадаючы можа зарэгістравацца на сайце https://gbcforum.by/ і паўдзельнічаць у анлайн-трансляцыі.*

Актуальнасць і важнасць удзелу Міністэрства юстыцыі ў гэтым праекце прадыктавана тым, што пытанні аказання адміністрацыйных працэдур — адзін з найважнейшых кірункаў узаемадзеяння дзяржавы з насельніцтвам, патлумачыла **Наталля ФІЛІПАВА, намеснік міністра юстыцыі:**

*— З 2018 года Мінюст каардынуе дзейнасць дзяржорганаў, арганізацый і службаў «Адно акно» з насельніцтвам. Гэта складаная шматгранная функцыя, якая ўключае мноства аспектаў галіновага, агульнага заканадаўства, а таксама рэгуляванне лічбавага ўзаемадзеяння дзяржавы з насельніцтвам. Падчас форуму, пэўна, можна будзе абмеркаваць існуючыя цяжкасці, якія не дазваляюць больш аператыўна і хутка вырашаць усе праблемы і здзяйсняць жаданні, і знайсці дадатковыя шляхі для ўзаемадзеяння.*

Міністэрства аховы здароўя плануе прэзентаваць працэсы па лічбавай трансфармацыі, якія адбываюцца ў ведамстве, абазначыў **Віктар СІДАРЭНКА, загадчык сектара праграмна-інфармацыйнага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя:**




Фота БелТА.

*— Пляцоўка форуму стане добрай падмогай у абмеркаванні падыходаў і правільнасці абранага міністэрствам курсу з улікам інтарэсаў дзяржавы, бізнесу і грамадзян.*

### QR-КОД, ЛІЧБАВЫ ПОДПІС І КРЫПТАГРАФІЧНЫ ТОКЕН АЎТЭНТЫФІКАЦЫІ

Форум стане таксама пляцоўкай для падрабязнай прэзентацыі васьмі біяметрычных дакументаў, якія ўводзяцца на тэрыторыі Беларусі. Плануецца расказаць пра іх асноўныя перавагі і развеяць асцярогі грамадзян наконт бяспекі і аховы інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў дакументах, нагадаў **Аляксей БЯГУН, начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў:**

*— Мы хочам прэзентаваць на форуме ўсю сістэму збору і выдачы біяметрычных дакументаў, каб грамадзяне былі спакойныя за ахову сваіх персанальных даных, за ахову ад несанкцыянаванага доступу да асабістай інфармацыі. А таксама пакажам усе тэхналогіі, якія ўкаранілі ў новыя дакументы, якія свядчаць асобу.*

Дакумент, які сведчыць асобу чалавека, мае візуальную інфармацыю, у якую ўключаны асноўныя персанальныя даныя: імя, імя па бацьку і прозвішча, дата нараджэння, грамадзянства, дата выдачы карткі і тэрмін яе дзеяння, пол. Гэтая ж інфармацыя зашыта ў QR-код, і яе можна счытваць з дапамогай спецыяльнага праграмнага забеспячэння.

*— У картку ўсталёны таксама бескантактны чып, у якім, акрамя дадатку ICAO, што будзе пасля выкарыстоўвацца грамадзянамі пры выездзе за мяжу, ёсць яшчэ электронны лічбавы подпіс і крыптаграфічны токен аўтэнтыфікацыі. Апошнія ахоўваюць інфармацыю, зашытую ў чып (у тым ліку фатаграфічную выяву, адбіткі пальцаў і візуальную інфармацыю на карт-цы) ад несанкцыянаванага доступу, магчымасці змены звестак ці іх сцірання, — удакладніў асноўныя крытэрыі, на якіх базіруецца сістэма аховы інфармацыі, Аляксей Бягун. — У краіне выкарыстоўваюцца толькі нацыянальныя сістэмы аховы інфармацыі. І праграма, якая ахоўвае інфармацыю з чыпа ID-карткі, распрацоўвалася менавіта айчыннымі спецыялістамі, каб поўнасцю выключыць магчымасць доступу збоку. Эксперты даюць гарантыю, што ў найбліжэйшыя дзесяць гадоў не з'явіцца тэхналогій, якія маглі б дазволіць ускрыць ID-картку і змяніць яе змест. Тым больш што сістэма працуе лакальна, без падключэння да інтэрнэту.*

На картцы няма звестак пра месца жыхарства, сямейнае становішча і наяўнасць дзяцей у чалавека, бо гэтая інфармацыя будзе атрымлівацца з дапамогай Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг на падставе рэсурсаў МУС або па асабістай згодзе чалавека, якую ён пацвердзіць сваім подпісам. Выключэнне — толькі для арганізацый, якія маюць права без згоды грамадзяніна атрымліваць такія звесткі з інфармацыйнай сістэмы МУС.

### У ВАС НАРАДЗІЛАСЯ ДЗІЦЯ! ЧАС СТАЦЬ НА ЧАРГУ. ВАШ ПАШПАРТ ГАТОВЫ

Сёння мы знаходзімся ў пярэдадзе пераходу да новай праграмы інфарматызацыі, завяршаючы папярэднюю (па развіцці лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства), у межах якой быў рэалізаваны глабальны праект па стварэнні «АПК «Платформы», які ўключыў у сябе адзін з элементаў — стварэнне новага асабістага кабінета, адзначыў Сяргей Руднеў:

*— Сёння гэтым кабінетам ужо можна карыстацца на сайце https://portal.gov.by/. У ім можна атрымаць разнастайныя паслугі. Пры гэтым профіль чалавека фарміруецца на падставе звестак, якія мы атрымліваем з дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў.*

Раней існаваў заяўны прынцып на адкрыццё асабістага кабінета, цяпер ён будзе выяўленчы. Асабістыя кабінеты ўсіх беларусаў будуць створаны на аснове дэперсаналізаваных даных аднамомантна, запэўніў прадстаўнік НЦЭП:

*— Асабісты кабінет будуецца на падставе чатырох відаў звестак, якія можна атрымаць з інфармацыйнага рэсурсу МУС. Кабінет актывуецца ў момант першага ўваходу карыстальніка з выкарыстаннем электронна-лічбавага подпісу. Калі чалавек у яго не ўваходзіў, кабінет лічыцца неактыўным, і звесткі накшталт штрафаў, пavестак, аліментаў, якія туды накіроўваюцца, не лічацца аўтаматычна атрыманымі. Тэхналогія выбудавана такім чынам, што чалавек будзе атрымліваць усе паведамленні пра яго ўзаемадзеянні з дзяржавай. Гэта і ёсць мэта стварэння адкрытага электроннага ўрада. Нават калі вы заказалі паслугу не праз інтэрнэт, а афлайн, у будучыні вам абавязкова прыйдзе інфармацыя пра гэта ваша дзеянне і анлайн — у ваш кабінет, і вы будзеце пра гэта памятаць.*

Тэхналогія электронна-лічбавага подпісу выкарыстоўваецца, каб усё было бяспечна. Калі чалавек уваходзіць у асабісты кабінет, аўтаматычна падымаюцца зашыфраваныя каналы сувязі, а далей сістэма працуе па зашыфраванай сетцы з інфармацыйнымі рэсурсамі, якія таксама забяспечваюць адпаведную ахову інфармацыі. Уладальнікі інфармацыйных рэсурсаў, якія ўтрымліваюць найбольшую колькасць персанальных даных, на варце больш за ўсіх, падкрэсліў эксперт:

*— Асабісты кабінет не абмежаваны толькі атрыманнем адміністрацыйнай працэдуры. Ён заклікаsuccessfully стаць адзіным пунктам уваходу грамадзяніна для ўзаемадзеяння абсалютна ва ўсіх сферах, у тым ліку ў адукацыі, медыцыне. Мы хочам стварыць чалавеку асяроддзе, дзе ён атрымае ўвесь набор паслуг, якія дазволяць яму камфортна існаваць.*

У будучыні сістэму плануюць адладзіць так, каб нават паслугі беларусам максімальна аказваліся па выяўленчым прынцыпе. Гаворка ідзе аб праактыўным электронным урадзе. Гэта калі цэнтралізаваная платформа, прынамсі, паведаміць чалавеку, што яго немаўля зарэгістравана, — толькі ўвядзіце імя, якое вы абралі, і забярыце пасведчанне аб нараджэнні. Потым сістэма прапануе выбраць дзіцячы садок, школу. Надышоў час сталення — сістэма паведаміць: прыйдзіце па пашпарт — ён гатовы. Аднак гэта можа стаць даступным пры паўнавартаснай інфарматызацыі ўсіх сфер жыццядзейнасці і эканомікі, папярэдзіў Сяргей Руднеў. Электронны ўрад — гэта не калі вы просіце, а калі інфармацыя, якую мае дзяржава, дазваляе змяніць ваша жыццё ў найлепшы бок адпаведна з вашымі жаданнямі і ўзростам.

**Ірына СІДАРОК.**

Жыллёвае будаўніцтва

# ЗЯМЛЯ БЕЗ АЎКЦЫЁНУ

## Прыватным інвестарам для ўзвядзення арэнднага жылля прапануюць спрыяльныя ўмовы

**Зараз у нашай краіне вядзецца работа па актывізацыі будаўніцтва арэнднага жылля за кошт розных крыніц і па прыцягненні прыватных забудоўшчыкаў. Спецыялісты прэс-службы Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва паведамляюць, што работа арганізавана па гэтай тэме ў двух кірунках.**

Па-першае, гэта ўцягванне пустых арэндных жылых памяшканняў дзяржаўнага жылфонду і прыватнага жылля фізічных асоб, якія маюць свабодныя кватэры для перадачы ў арэнду па рынкавай цане. Наступным напрамкам стане нарошчванне аб'ёмаў будаўніцтва арэнднага жылля за кошт стварэння эканамічных умоў і стымулявання прыватных інвестараў на ажыццяўленне такога будаўніцтва. Забяспечваца арэндным жыллём будуць перш за ўсё тыя людзі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў з дзяржаўнай падтрымкай у выглядзе субсідый на частковую кампенсацыю арэнднай плацяжоў.

Як адзначылі ў міністэрстве, каб прыцягнуць прыватных забудоўшчыкаў да будаўніцтва арэнднага жылля, плануецца даваць ім без аўкцыённых таргоў адразу некалькі зямельных участкаў для будаўніцтва арэнднага жылля і жылога дома на камерцыйных умовах. Пры гэтым зямельныя ўчасткі павінны быць перададзены без абцяжаранняў, гэта значыць без будынкаў пад знос.

Будаўніцтва інжынерных сетак для арэнднага дома плануецца ажыццяўляць за кошт дзяржавы, а для камерцыйнага дома прадугледжана кампенсацыя за кошт бюджэту ў памеры 50 %. Магчыма, будуць давацца падатковыя льготы, а менавіта вызваленне ад падатку на прыбытак часткі валавога прыбытку, якая накіроўваецца арганізацыяй на будаўніцтва або набыццё арэнднага жылля. Таксама абмяркоўваецца магчымасць атрымання крэдытаў для будаўніцтва такіх дамоў з больш нізкай працэнтнай стаўкай у выпадку, калі вялікую частку сродкаў унясе сам забудоўшчык.

У прэс-службе міністэрства таксама адзначылі, што за першы квартал бягучага года аб'ём агульнага ўводу жылля ў эксплуатацыю склаў 1 млн 127,4 тысячы квадратных метраў, што складае 28,2 % ад гадавога задання. З іх з дзяржаўнай падтрымкай пабудавана 322 тысячы «квадратаў», або 32,2 % ад плана на бягучы год.

Характэрна, што лідзіруючае месца па аб'ёме агульнага ўводу жылля за гэты перыяд займае Мінск, дзе здадзена ў эксплуатацыю 44,1 % ад устаноўленага задання. Далей ідуць Гродзенская і Брэсцкая вобласці, дзе пабудавана адпаведна 33,5 % і 30,7 % ад задання.

Што датычыцца цэн на жыллё, то, паводле інфармацыі спецыялістаў ведамства, у нашай краіне прыняты шэраг мер па рэгуляванні кошту жылля, якое будуецца з дзяржаўнай падтрымкай. Так, устаноўлены лімітавы сярэдні кошт 1 квадратнага метра жылля ў памеры 1 тысячы 152,5 рубля.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Дадатковыя гарантыі

## Бронь для прыёму на работу

**У студзені—сакавіку 2021 года ў службу занятасці звярнуліся і зарэгістраваліся ў якасці беспрацоўных 3862 грамадзяніны, якія маюць дадатковыя гарантыі занятасці. (Гэта 22,9 працэнта ад агульнай колькасці зарэгістраваных беспрацоўных.)**

Усяго дапамаглі знайсці пастаянную работу 2281 чалавеку. Сярод іх 831 беспрацоўны з ліку бацькоў у шматдзетных і няпоўных сем'ях, 436 чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, 430 грамадзян, якіх вызвалілі з месцаў пазбаўлення волі, 258 асоб перадпенсійнага ўзросту, 132 маладыя чалавекі ва ўзросце да 21 года, што шукалі работу ўпершыню, 131 ваеннаслужачы, звольнены з ваеннай службы, 27 асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, 21 ветэран баявых дзеянняў, восем грамадзян, якія выехалі з тэрыторый радыеактыўнага забруджвання, чатыры грамадзяніны, звольненыя з альтэрнатыўнай службы, і трое дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

Дзяржава забяспечвае дадатковыя гарантыі ў галіне садзейнічання занятасці насельніцтва грамадзянам, якія асабліва маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне і не здольныя на роўных умовах канкурыраваць на рынку працы. Дадатковыя гарантыі забяспечваюца шляхам устанаўлення наймальнікам броні для прыёму на работу, аказання паслуг па прафесійнай арыентацыі, арганізацыі навучання па запатрабаваных на рынку працы прафесіях, адаптацыі інвалідаў да працоўнай дзейнасці.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# БЕЛАРУСЬ — КРАІНА ДЛЯ АДПАЧЫНКУ,

## або Смак нацыянальнага каларыту

**Мінск стаў міжнароднай сталіцай адпачынку. У Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» з 23 да 25 красавіка прайшла 23-я вясенняя Міжнародная выстаўка-кірмаш «Адпачынак-2021». Прадстаўнікі турыстычных арганізацый, аграсядзіб, санаторыяў, забаўляльных комплексаў сабраліся разам, каб даць старт новаму турыстычнаму сезону і абмеркаваць, як будзе развівацца сфера сёлета. У межах выстаўкі прайшлі майстар-класы ад рамеснікаў, міні-рэканструкцыі гістарычных падзей, варкшопы і прэзентацыі новых турыстычных маршрутаў. «Адпачынак-2021» — самая буйная турыстычная выстаўка ў Беларусі, якая стала выдатнай пляцоўкай для наладжвання дзелавых сувязяў, пошуку новых кліентаў і атрымання ведаў аб новых трэндах індустрыі.**



Прывітаў удзельнікаў і гасцей выстаўкі **генеральны сакратар Сусветнай турысцкай арганізацыі Зураб ПАЛАЛІКАШВІЛІ.** Па яго словах, выстаўка «Адпачынак-2021» з'яўляецца важнай пляцоўкай для ўкаранення новых ідэй і развіцця супрацоўніцтва, што дазволіць турызму «стаць драйверам у працэсе аднаўлення ад наступстваў крызісу». У сваім прывітальным слове ён падзякаваў Беларусі за развіццё турызму і асабліва — турызму ў вёсцы: «Дазвольце выказаць падзяку вашай краіне за ініцыятывы развіцця турызму ў сельскай мясцовасці. Гэта прыярытэт у нашай рабоце».

**Намеснік міністра спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Міхаіл ПАРТНОЙ** падкрэсліў, што ў цэнтры выстаўкі «Адпачынак-2021» — унутраны турызм. Кожны рэгіён прадставіў свае адметнасці ў сферы адпачынку і гасціннасці. Дзякуючы разнастайнасці эксклюзіўных прапаноў кожны турыст знойдзе для сябе цікавы варыянт адпачынку. Менавіта такім чынам па-новаму раскрываецца турыстычны патэнцыял краіны: «Гэтая выстава — добрая пляцоўка для руху наперад. Турыстычныя патокі патроху аднаўляюцца. Хацелася б, вядома, каб гэта адбывалася хутчэй. Разам з тым вакцынацыя



зробіць сваю справу: граніцы, мы думаем, пачнуць паступова адкрывацца, і мы будзем падарожнічаць. Для Беларусі адкрыццё граніц не стане нечаканасцю — мы прапануем якасны турыстычны прадукт на любы густ».

### АДКРЫЦЬ У САБЕ ТВОРЧЫЯ ЗДОЛЬНАСЦІ

На шматлікіх стэндах выставы былі прадстаўлены традыцыйныя заняткі, якія абавязкова зацікавяць турыстаў, — беларускія рамёствы. Асабліва ў гэтым вызначылася дэлегацыя з Мсціслава. Рыгор Свядомскі паабяцаў навучыць усіх ахвотных разьбе па дрэве. Майстар прывёз з сабой міні-галерэю сваіх найлепшых вырабаў. Па яго словах, замежныя турысты гатовыя плаціць любыя грошы, каб набыць творы мастацтва з беларускіх дрэў, зробленыя беларускімі майстрамі. А каваля Сяргея Кудзікава ведае кожны, хто хоць раз бываў на буйных мерапрыемствах рэспубліканскага маштабу. Сярод сучасных беларускіх рамеснікаў ён сапраўдная зорка. «Як рамеснік я магу прапанаваць турыстам цікавы варыянт баўлення вольнага часу — майстар-клас па кавальскай справе. Пакажу, як на самай справе працавалі сапраўдныя кавалі. Разам са сваімі калегамі мы можам правесці гістарычную рэканструкцыю рыцарскага бою, прадэманстраваць рыцарскія даспехі, даць майстар-клас па гістарычным боі, фехтаванні. Усе бачылі гэта па тэлебачанні або ў інтэрнэце, але не кожны меў магчымасць прымераць рыцарскія даспехі, сфатаграфавацца ў іх. На жаль, гэтае звяно, якое я прадстаўляю, ужо выпадае са сферы інтарэсаў людзей і асабліва моладзі. Сёння кузня ўспрымаецца як нешта дзіўнае. Людзі не разумеюць, як вырабы з металу можна рабіць сваімі рукамі, а не на заводах. І мая задача, як і маіх калег, — захаваць, паказаць і перадаць гэтыя навыкі. Я ўваходжу ў клуб рамеснікаў, кожны дзень 70 майстроў робяць ювелірную работу, ствараюць незвычайныя рэчы. Людзей часам не здзівіць архітэктура, яны могуць шмат дзе яе бачыць. А старыя рамёствы — заўсёды цікава. Тым больш калі турысты самі ўключаюцца ў працэс, прымяраюць фартух каваля і робяць нешта сваімі рукамі. А калі яны ад'язджаюць з сувенірамі, то ўражанні застаюцца на ўсё жыццё. Я ўпершыню на такой выставе і вельмі задаволены. Гэта выдатная пляцоўка для абмену вопытам і наладжвання сувязяў з калегамі для будучай сумеснай працы», — падзяліўся мсціслаўскі каваль.

Прадстаўнікі магілёўскага этнаграфічнага комплексу традыцыйных народных рамёстваў прапанавалі ўдзельнікам і гасцям выстаўкі зборы скрыпеню, вядомага таксама як іван-чай. Карысную расліну яны збіраюць у запаведным пячорскім гаі, дзе размяшчаецца комплекс. Напоі на аснове скрыпеню — візітка комплексу. Па словах гаспадароў, турысты раўнадушнымі не застаюцца.

Самымі папулярнымі на выстаўцы былі стэнды з дэгустацыямі, дзе майстры беларускай кухні паказалі сябе ва ўсёй красе. Сыры, каўбасы, саленні, сала, ягады, варэнне, мёд, знакаміты беларускі самагон, дамашні хлеб — гурманам было што ацаніць. Дарэчы, гастранамічны турызм — новы кірунак у беларускім турызме. Але нешта падказвае, што ён вельмі хутка стане папулярным ва ўсіх, хто жадае лепш пазнаёміцца з краінай.

### АД СЛАВЯНСКІХ БАГОЎ ДА ІНДЗЕЙСКІХ ЗАБАВАК

Майстар-класы па розных традыцыйных беларускіх рамёствах, зборы карысных траў, знаёмства з кухняй і яшчэ мноства заняткаў, характэрных для беларускага народа і тым адметных, кожны турыст можа ацаніць у аграсядзібах. Паколькі галоўнай тэмай выстаўкі



«Вялікі гонар удзельнічаць у такім форуме. Для мяне ганарова сёння падзяліцца сваёй гісторыяй дзяўчынкі, якая прыйшла ў секцыю спартыўнай гімнастыкі з марай стаць алімпійскай чэмпіёнкай, і спартсменкі з багажом медалёў, якая змагла знайсці сябе ў жыцці. Калі заканчваецца спорт, выключаюцца фанфары, згортваюцца чырвоныя дарожкі, ты застаешся сам-насам з сабой у гэтым вялікім свеце, які часам бывае вельмі жорсткі. У спорце ўсё проста — ты ведаеш свайго саперніка, рыхтуешся, ведаючы яго слабыя і свае моцныя бакі, ведаеш, калі максімальна ўключыцца ў барацьбу. А тут усё інакш. У нас, у спартсменаў, два жыцці — спартыўнае і «цывільнае», — адзначыла Святлана.

Святлана Хоркіна першы раз стала алімпійскай чэмпіёнкай у 17 гадоў. На Алімпійскіх гульнях 1996 года ў Атланце, дзе яна лічылася фаварыткай, перамагла ў практыкаваннях на брусах. «Гэта быў цікавы час. У 1996 годзе была мая першая Алімпіяда, мне было ўсяго 17 гадоў. Пасля Алімпіяды 1992 года нашы краіны ўпершыню выступалі пад сваімі сцягамі як самастойныя. І было вельмі няпроста, асабліва ў плане падрыхтоўкі да гэтых Гульняў. Вядома, пасля першай Алімпіяды ў 17-гадовай дзяўчынкі мара спраўдзілася — яна стала алімпійскай чэмпіёнкай. І я заявіла, што заканчваю са спортам. Я вярнулася ў родны Белгарад, абышла там усе кінатэатры. Да гэтага я паспела паступіць у наш Белгарадскі дзяржаўны ўніверсітэт на факультэт фізкультуры і спорту. І як усе студэнты, пачала вучыцца. Але калі ёсць недаказанасць, то спартсмен гэта адчувае і разумее. І пачуўшы ад свайго трэнера: «Хоркіна яшчэ не ўсё сказала» — я сабрала рэчы і з'ехала на алімпійскую базу».

На Алімпійскіх гульнях 2000 года ў Сіднеі Святлана ў камандным першынстве выканала скачок, які пасля быў названы «Хоркіна ІІ». Яна паказала добрыя вынікі ў вольных практыкаваннях і на брусах. На спаборніцтвах па апорным скачку адбылася беспрэцэдэнтная сітуацыя: конь для скачкоў быў устаноўлены на пяць сантыметраў ніжэй, чым павінен быць паводле нормы. Праз гэта Хоркіна і шэраг іншых спартсменак зрабілі нехарактэрныя для іх памылкі. Суддзі дазволілі гімнасткам паўтарыць скачкі, але адмовіліся выпраўляць адзнакі на іншых снарадах. Святлана Хоркіна адмовілася паўтарыць выступленне і ў слязах пакінула памост. У выніковай табліцы яна заняла толькі 10-е месца. Але тытул чэмпіёнкі на брусах яна захавала.

«У 2000 годзе я ўжо была вопытнай гімнасткай, першай у свеце. І было б выдатна выйграць усё. Але ўмяшаліся чорныя сілы. Калі б нашы функцыянеры маглі б адстаяць нашы правы і развіць тую сітуацыю на карысць спартсмена, трэнера, краіны, не ведаю, што было б. Той факт, што гэта сітуацыя не была разабрана ў юрыдычнай і прававой сферы, пакінуў недаказанасць і даў мне падставу прыняць рашэнне аб трэцяй Алімпіядзе».

У 2004 годзе на сваіх апошніх Алімпійскіх гульнях у Афінах Святлана Хоркіна зноў была фаварытам. Але выйшла ў фінал толькі ў мнагабор'і і на брусах. Яе выступленні дапамаглі расійскім гімнасткам выйграць «бронзу».

«Скончылася Алімпіяда 2004 года, усё было выдатна, мы атрымалі віншаванні. Нас сустракалі на Радзіме і гэта вельмі прыемна — быць не толькі прызнанай ва ўсім свеце, але і ў сябе дома. Я прыняла рашэнне заняцца грамадскай дзейнасцю, што я рабіла падчас спартыўнай кар'еры. Бог мне падарыў магчымасць нарадзіць дзіця адразу пасля заканчэння кар'еры, што вельмі важна для жанчыны».

У сваім «цывільным» жыцці Святлана Хоркіна займаецца грамадскай дзейнасцю. Паралельна з нацыянальным форумам атлетаў у Мінску ў Белгарадзе праходзілі 22-я Усерасійскія спаборніцтвы па спартыўнай гімнастыцы на прызы Святланы Хоркінай, куды, дарэчы, яна запрасіла і беларускіх гімнастаў. Сваім вопытам самарэалізацыі пасля спартыўнай кар'еры былы дэпутат Дзяржаўнай Думы, цяпер першы намеснік кіраўніка ЦСКА, падзялілася з беларускімі атлетамі, пажадаўшы ім поспехаў у спартыўнай кар'еры і пасля яе.

## Дар'я НАВУМАВА:

# «ЯК МОЖНА НЕ ЛЮБІЦЬ ШТАНГУ?»

## Моцныя думкі моцнай дзяўчыны

**Спартсмены — людзі моцныя не толькі целам, але і духам. Спорт вучыць думаць на тры крокі наперад, аналізаваць сітуацыю і прымаць правільныя рашэнні. Таму ў атлетаў ёсць чаму павучыцца, да іх думак варта прыслухоўвацца. У рубрыцы «Моцныя думкі» мы прапануем даведацца, пра што думаюць спартсмены.**

Гісторыя Дар'і Навумавай, дзяўчыны з вёскі Патока, што на Магілёўшчыне, падобная на казку. У цяжкую атлетыку трапіла амаль выпадкова, прыйшла за кампанію з сяброўкай. А ў 21 год стала срэбраным прызёрам Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра. Толькі казачным гэты сцэнарый назваць нельга. Усе свае медалі — «серабро» чэмпіянату свету 2018 года, «золата» чэмпіянату Еўропы 2019 і мноства іншых — Дар'я заваявала не па ўзмаху чароўнай палачкі, а выключна сваёй працай і ўпартасцю. На чэмпіянаце Еўропы 2021 года ў Маскве спартсменка выйграла малую бронзавую ўзнагароду. Зараз яна актыўна рыхтуецца да Алімпійскіх гульняў у Токіа. Аб чым думае моцная (ва ўсіх сэнсах гэтага слова) дзяўчына, яна расказала «Звяздзе».

### «Сядзець на адным месцы не спадабалася»

**Чэмпіянат Еўропы.** Сваім выступленнем на чэмпіянаце Еўропы я задаволена. Свой вынік я палепшыла, магла б, вядома, выступіць і лепш. Але ўжо як атрымалася, так атрымалася. Гэта быў першы турнір амаль за год, і ўжо добра, што ён увогуле адбыўся. Увесь гэты год мы правялі на закрытых зборах у Стайках. Пастаянна былі там на каранціне і нікуды не выходзілі. Нават дадому, да сям'і не атрымлівалася з'ездзіць. Па-першае, гэта было небяспечна, а па-другое, потым прыйшлося б зноў сядзець на каранціне і лішні раз нервавацца.

**Перанос спаборніцтваў.** Чэмпіянат Еўропы па цяжкай атлетыцы пераносілі, мабыць, больш разоў, чым астатнія турніры. І кожны раз перажываць перанос было вельмі цяжка. Псіхалагічна нават цяжэй, чым фізічна. Мы толькі выходзілі на пік формы, рыхтаваліся да выступленняў, і аказвалася, што гэта амаль дарма. І прыходзілася збаўляць абароты, правільна размяркоўваць нагрузку, каб пазбегнуць траўм.

**Жыццё без турніраў.** Мне здаецца, нават звычайнаму чалавеку цяжка некалькі месяцаў запар сядзець у чатырох сценах. Што ўжо казаць пра спартсменаў, якія пастаянна ў раз'ездах. І ад трэніровак, якія нічым не разбаўляюцца, вельмі стамляешся. Рыхтуешся, працуеш — а мэты, дзеля якой ты гэта робіш, фактычна няма. І гэтая стомленасць, апатыя збіраецца, а потым праз яе пачынаюцца траўмы, няўдалыя выступленні. Таму навіна аб тым, што чэмпіянат Еўропы ў Маскве ўсё ж такі адбудзецца, была для нас як свята. За год усе вельмі засумавалі па спаборніцтвах. А сядзець на адным месцы не спадабалася.



Фота: Беларускі цяжкаатлетычны саюз.

**Саперніцы.** Едучы на чэмпіянат Еўропы, я, як і ўсе спартсмены, настройвалася на барацьбу. Паколькі цэлы год у нас не было спаборніцтваў, трэба было быць падрыхтаванай да таго, што з'явяцца новыя саперніцы. Мы былі гатовыя, што чэмпіянат Еўропы падкіне шмат сюрпрызаў. Так яно і атрымалася. Напрыклад, расіянкі, якія раней выступалі ў меншай катэгорыі, перайшлі ў маю катэгорыю. Адпаведна, у мяне стала больш канкурэнтак. Нас здзівіла ўкраінская спартсменка. Мы не бачылі сапернікаў каля года і не ведалі, у якой яны форме, хто на што здольны. У звычайных абставінах на працягу сезона мы можам назіраць адзін за адным і ўлічваць гэта ў сваёй падрыхтоўцы. Таму я не выключаю, што на Алімпійскіх гульнях у Токіа таксама будзе шмат сюрпрызаў, і спаборніцтвы стануць яшчэ цікавейшымі.

### «У кожнай спробе раблю ўсё магчымае»

**Узрост і мяжа здольнасцяў.** Цяжка сказаць, ці ёсць у цяжкай атлетыцы ідэальны ўзрост. У нас такі спорт, дзе ўсё залежыць ад унутраных рэсурсаў арганізма, яго асаблівасцяў. Я не раўняла б усіх па адным узросце. Не магу сказаць, ці ёсць канчатковая вага, якую можа падняць цяжкаатлет, бо гэта таксама залежыць ад індывідуальных якасцяў. І, канешне, многае вырашае праца, якую спартсмен кожны дзень выконвае на трэніроўках, яго рысы характару, мэтанакіраванасць, жаданне перамагаць. Чалавечыя магчымасці бязмежныя, і мы, спартсмены, гэта пастаянна даказваем.

**Штанга любіць дакладнасць.** У цяжкай атлетыцы дробязяў не бывае. Каб суддзі залічылі падыход, тэхніка павінна быць ідэальнай. Былі моманты, калі мне не залічвалі падыход, бо не так былі пастаўлены локці, плечы «гулялі». Таму дакладнасць у цяжкай атлетыцы — гэта абсалютна правільнае тэхнічнае выступленне без «гуляючых» локцяў ці плячэй.

**Адказнасць чэмпіёнкі.** Выходзячы на памост, я не думаю аб тым, што трэнеры, кіраўніцтва, аматары, чакаюць ад мяне выдатнага выступлення. Вядома, усе чакаюць, што на кожным выступленні я буду паказваць клас. Гэта іх права. У кожнай спробе я раблю ўсё магчымае, што магу.

**Псіхалагічны настрой.** Настройваюся на выступленне заўсёды па-рознаму. Як кажуць, у залежнасці ад таго, з якой нагі ўстала ранкам. Нязменна адно: заўсёды побач — мой трэнер, які ўжо стаў і сябрам, і бацькам. Ён мой найлепшы псіхолаг, заўсёды знойдзе патрэбныя словы, каб настроіць на выступленне, накіроўвае думкі ў правільнае рэчышча. Стараюся ў сваіх думках не заходзіць далёка, але і не зацыкліваюся на тым, што буду рабіць зараз.

**Аматары.** Мне здаецца, па тэлебачанні за спаборніцтвамі заўжды назірае больш людзей, чым на трыбунах. Тым больш цяпер, калі турніры праходзяць без гледачоў. Таму не магу сказаць, наколькі мне важная падтрымка трыбун. Калі я выходжу на памост, не тое што публікі на трыбунах не заўважаю — нічога, акрамя штангі, не бачу. А мае самыя галоўныя аматары — гэта людзі, якія выводзяць мяне на памост, — трэнеры. І сям'я, вядома.

**Любімае практыкаванне.** У мяне часта пытаюцца, якое практыкаванне з цяжкай атлетыкі я люблю больш: штуршок ці рывок. А што я мушу на гэта адказваць? Мы павінны іх сумяшчаць і аднолькава добра паказваць. Часам адно атрымліваецца лепш, другое горш, але гэта не прычына не ўдасканальваць кожнае. Не магу вылучыць адно практыкаванне, стараюся кожнае рабіць аднолькава добра.

**Дыета.** Паколькі цяжкая атлетыка прадугледжвае выступленне ў пэўных вагавых катэгорыях, лічбы на вагах павінны заўсёды быць адныя і тыя ж. Але ніякіх дыет я не прытрымліваюся. За столькі гадоў арганізм прывык да сваёй вагі. Лішнія 2-3 кілаграмы — не бяда, да спаборніцтваў яны лёгка сыходзяць. У маёй кар'еры былі выпадкі, калі прыходзілася экстранна зганяць некалькі кілаграмаў за кароткі тэрмін. У цяжкай атлетыцы гэтым нікога не здзівіш. Не самы прыемны вопыт, хачу сказаць.

**Знакавыя спаборніцтвы.** Кожны турнір дае свае ўрокі, кожны дае новы вопыт: згонка вагі, фізічнае ўдасканаленне, псіхалагічныя асаблівасці. Не бывае аднолькавых турніраў, кожны адметны. Акрамя Алімпійскіх гульняў у Рыа, мне асабліва запомніўся чэмпіянат Еўропы—2019 у Батумі, дзе я заваявала «золата». Неаднаразова выступала ў Грузіі, і ў мяне заўсёды там усё добра складваецца.

### «Нежаночы спорт. Ну і што?»

**Сябры ў спорце.** За столькі гадоў у цяжкай атлетыцы сяброў з гэтай сферы ў мяне так і не з'явілася, акрамя нашых беларускіх спартсменаў. На спаборніцтвах не да сяброўства ўсім: няма ні часу, ні магчымасці пасябраваць. А трэніруецца кожная каманда сама па сабе, як правіла.

**Сям'я.** У мяне няма адказу на пытанне, адкуль у дзяўчынкі з неспартыўнай сям'і такая любоў да спорту. Мае родныя ніяк не звязаны са спортам. Таму я адзіная спартсменка ў сям'і.

**Спартыўны характар**. Спорт накладвае на чалавека свой адбітак, гэта непазбежна. Жыццё атлета зусім іншае, чым у астатніх. І ад гэтага спартсменам часта бывае цяжка ў неспартыўным жыцці. Звычкі, характар — усё іншае. Але дысцыпліна і мэтанакіраванасць, якія развівае спорт, мне здаецца, нікому не перашкодзяць.

**Чужыя парады.** Я ўжо колькі гадоў чую, што цяжкая атлетыка — не жаночы від спорту. Ну і што? Большасць людзей толькі і ўмеюць, што парады раздаваць і вучыць жыць. Гэта робяць людзі, якія не могуць знайсці сваю справу і чагосьці ў ёй дасягнуць. А спартсмены ставяць сабе мэту і ідуць да яе, нягледзячы ні на што.

**Любоў да штангі.** З кожным годам у цяжкай атлетыцы я ўсё больш люблю штангу. Гэта адбываецца з кожным цяжкаатлетам. Са штангай мы заўсёды разам — на трэніроўках, на спаборніцтвах, з ёй мы дасягаем перамог і перажываем паражэнні. У нас усё жыццё са штангай. І як яе можна не любіць?

**Адрэналін.** Некалькі гадоў таму я скокнула з парашутам. Проста захацелася адчуць, як гэта. Захацела экстрыму, адрэналіну. Мне вельмі спадабалася. Пакуль нічога такога не хочацца, але, я думаю, нешта цікавае і незвычайнае яшчэ прыйдзецца адчуць і перажыць.

**Матывацыя.** Мяне матывуюць мэты, якія перад мной стаяць, і людзі, з якімі я іх стаўлю і дасягаю.

# «ПАТЭНЦЫЯЛЬНА ПУЦЁЎКІ НА АЛІМПІЯДУ МОГУЦЬ ЗАВАЯВАЦЬ УСЕ НАШЫ СПАРТСМЕНЫ»

## Як настройваюцца на Гульні беларускія стралкі

**Псіхолагі лічаць, што заняткі гэтым відам спорту — генетычна абумоўлены інстынкт, выкліканы пачуццем самазахавання. Перадумовы яго развіцця ўзніклі ў старажытнасці, калі чалавек вынайшаў першыя прылады для палявання. Першыя спаборніцтвы па гэтым відзе спорту праходзілі ў Еўропе яшчэ ў XV—XVI стагоддзях. А першыя медалі былі разыграны на першых Алімпійскіх гульнях сучаснасці — у 1896 годзе ў Афінах па ініцыятыве самога П'ера дэ Кубертэна. Барон быў сміразовым чэмпіёнам Францыі ў гэтым відзе спорту. Бадай ці не самы старажытны спорт з багатай гісторыяй — стралковы спорт.**

На Беларусі стралковы спорт не новы. У 1920-х гадах была створана ўсесаюзная сістэма Усеагульнага ваеннага навучання, ключавым кампанентам якой была кулявая стральба. Стралкі трэніраваліся ў цірах фізкультурна-спартыўнага таварыства «Дынама». У 1927 годзе былі створаны Саюз таварыстваў сяброў абароны і авіяцыйна-хімічнага будаўніцтва БССР, які даваў пачатковую стралковую падрыхтоўку і ў 1932 годзе зацвердзіў Палажэнне аб значку «Варашылаўскі стралок». У 1934 годзе варашылаўскімі стралкамі лічыліся 25 тысяч беларускіх спартсменаў-аматараў. Але на Алімпійскіх гульнях беларускія снайперы выступілі толькі ў 1964 годзе і, пачынаючы з той Алімпіяды ў Токіа, пастаянна ўваходзілі ў алімпійскія каманды СССР. Першым алімпійскім чэмпіёнам стаў Аляксандр Газаў, трыумфатар Алімпіяды 1976 года ў Манрэалі. Дзякуючы Сяргею Мартынаву беларускі гімн пасля стралковых спаборніцтваў гучаў і на Алімпійскіх гульнях у Лондане ў 2012 годзе. Сяргей Мартынаў — трохразовы чэмпіён свету і ўладальнік яшчэ двух бронзавых алімпійскіх медалёў. Цэлы россып медалёў сабраў і Ігар Басінскі — шэсць залатых, два сярэбраныя і два бронзавыя медалі чэмпіянатаў свету, два «серабра» і дзве «бронзы» Алімпійскіх гульняў. Адразу пасля заканчэння спартыўнай кар'еры ён узначаліў нацыянальную зборную: Ігар Басінскі падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» цікавымі фактамі пра справу свайго жыцця.

### СТРАЛКОВАЯ МАТЭМАТЫКА

На Алімпійскія гульні ў Токіа гэтым летам дакладна паедуць тры беларускія снайперы — Марыя Мартынава, Вікторыя Чайка і Юрый Шчарбацэвіч. З 20 мая да 6 чэрвеня ў Харватыі пройдзе чэмпіянат Еўропы, дзе будуць разыгрывацца яшчэ ліцэнзіі. «Патэнцыяльна пуцёўкі на Алімпіяду могуць заваяваць усе нашы спартсмены, мы разлічваем на кожнага. У фінал выходзяць восем найлепшых стралкоў па выніках кваліфікацыі. І ўсе вынікі ў фінале анулююцца. Таму ўсё вельмі непрадказальна. Хто пераможа — той атрымлівае ліцэнзію. Калі ў гэтага спартсмена яна ўжо ёсць — пераходзіць да іншага», — тлумачыць Ігар Міхайлавіч. Колькасць ліцэнзій на краіну абмежаваная — па дзве ліцэнзіі на адно практыкаванне. Кожная краіна можа зарабіць 20 ліцэнзій на адны Гульні, бо ўсяго ў стралковым спорце 10 алімпійскіх дысцыплін. У выступленнях з вінтоўкай два алімпійскія практыкаванні — стральба з класічнай і малакаліберная вінтовак з трох становішчаў: на калене, стоячы і лежачы. Таксама і ў стральбе з пісталетам ёсць па два алімпійскія практыкаванні з малакаліберным і пнеўматычным пісталетамі. Гэта што датычыцца кулявой стральбы.

Стралковы спорт уключае ў сябе і стэндавую стральбу. Спартсмены страляюць з гладкаствольных ружжаў дробавымі зарадамі па спецыяльных мішэнях. У алімпійскую праграму ўключаны дзве дысцыпліны. Круглы стэнд — спартсмен праходзіць восем пляцовак, страляючы па «талерачках», якія вылятаюць на рознай вышыні. Траншэйны стэнд — спартсмен страляе па «талерачках», якія вылятаюць з траншэі ў выпадковым кірунку. Спартсмен да апошняга не ведае, куды паляціць яго мішэнь. Рэакцыі стэндавых стралкоў можна толькі пазайздросціць.

Для кожнага стралка зброя падбіраецца індывідуальна. Спартсмены самі даглядаюць свае вінтоўкі і пісталеты. Па словах Ігара Басінскага, ад гэтага залежыць выступленне: «Калі на старце ламаецца зброя — спартсмен адразу выбіваецца з калеі. Рамонт, перажыванні марнуюць час. Зброя заўсёды павінна быць чыстая, гатовая, каб пазбегнуць форс-мажораў. Мне пашанцавала — у мяне не было такіх праблем. Сяргей Мартынаў доўга страляў з адной вінтоўкі, таму што ўважліва сачыў за сваёй зброяй». Дарэчы, спартыўныя пісталеты і вінтоўкі ў Беларусі не вырабляюцца, усё закупаецца за мяжой.



Фота Беларускай федэрацыі стралковага спорту.

### АДКРЫТЫЯ ЦІРЫ — АДКРЫВАЮЦЬ ВЯЛІКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Спаборніцтвы па кулявым спорце праходзяць у адкрытых цірах. І гэта значна ўскладняе паўнавартаснае развіццё спорту ў рэгіёнах. Як расказаў Ігар Басінскі, з кожным нацыянальным стартам удзельнікаў з рэгіёнаў становіцца ўсё больш. Калі раней у кожным практыкаванні было па 15-20 чалавек, цяпер — па 50-60 спартсменаў. Але не ўсё так выдатна. «Для таго каб у рэгіёнах добра развіваўся стралковы спорт, неабходныя адкрытыя ціры. У краіне такі цір ёсць толькі ў Мінску, пабудаваны да II Еўрапейскіх гульняў, ён адпавядае ўсім міжнародным стандартам. У рэгіёнах стаіць якаснае сучаснае абсталяванне. Але дзеці трэніруюцца «пад лямпачкай», як у мінулым. І калі летам прыязджаюць на турніры ў Мінск, яны не разумеюць, што рабіць. Стральба ў закрытым ціры — гэта адна справа, там аднолькавае святло, няма ветру. А на свежым паветры ўсё наадварот — ярка свеціць сонца ці пахмурна, дзьме вецер. І ў спартсменаў не атрымліваецца паказаць тое, чаму іх вучылі, бо няма належных умоў для трэніровак», — расказвае Ігар Басінскі.

Выступленні на адкрытай прасторы патрабуюць пэўнай тактыкі, стратэгіі і... псіхалагічнай падрыхтоўкі. «Стралкі павінны быць добра падрыхтаваныя псіхалагічна. У фінале ўсе балы за кваліфікацыі абнуляюцца і восем фіналістаў пачынаюць усё нанава. Найлепшым становіцца той, хто спакайней адстраляе. Здараецца, што лідары выходзяць у фінал і там апускаюцца на апошнія месцы, ці, наадварот, спартсмены з апошніх пазіцый падымаюцца наверх. Усё можна змяніцца за адзіны выстрал — падзьмуў ветрык, праляцела птушка — спартсмен адцягнуўся, і ўсё змянілася. Таму вопытныя спартсмены стараюцца адстраляцца як мага хутчэй, бо надвор'е можа змяніцца ў горшы бок», — растлумачыў Ігар Міхайлавіч.

### СПОРТ, ЯКОМУ ЎСЕ ЎЗРОСТЫ ПАКОРНЫЯ

Урачы рэкамендуюць пачынаць займацца стралковым спортам у 11-12 гадоў, калі арганізм ужо сфарміраваны. Ідэальнага ўзросту для дасягнення высокіх вынікаў няма. Канстанцін Лукашык стаў алімпійскім чэмпіёнам у 16 гадоў, а Сяргей Мартынаў — у 44-гадовым узросце. Але гэта хутчэй выключэнні з правіл. Калі абагульніць, то на пік формы спартсмены выходзяць да 30 гадоў.

Асноўная нагрузка ў стралкоў прыходзіцца не на вочы, як можа здацца на першы погляд, а на пазваночнік. Па словах Ігара Басінскага, гэтаму ёсць лагічнае тлумачэнне — спартсмен некалькі гадзін стаіць з вінтоўкай вагой у шэсць кілаграмаў. Адсюль і самыя распаўсюджаныя траўмы — праблемы з пазваночнікам, спінай, кровазваротам. Юрый Шчарбацэвіч нават перанёс аперацыю. На вочы, на якія таксама прыходзіцца вялікая нагрузка, стралковы спорт амаль не ўплывае. Існуе шэраг прыстасаванняў, якія аблягчаюць іх работу.

Каб было лягчэй, вінтовачнікі выступаюць у спецыяльных касцюмах, што падтрымліваюць мышцы спіны і паясніцы, у спецыяльным абутку, які фіксуе галенастопы. Пісталетчыкі выступаюць у звычайным адзенні, але ў спецыяльным абутку. На трэніроўках стралкі ўмацоўваюць мышцы спіны і плячэй. Найлепшыя памочнікі ў гэтым — плаванне і лёгкі крос. А вось меткасць, без якой у стралковым спорце быць немагчыма, натрэніраваць амаль немагчыма. Яна ці ёсць ад прыроды, ці яе няма.

### НЯТАННАЕ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ

Сёння самыя моцныя школы стралковага спорту — у Індыі, Кітаі, Расіі, Германіі. На пытанне, што можна пераняць у гэтых школ, Ігар Басінскі дае самы актуальны адказ — грошы: «Там працуюць нашы трэнеры, што нам пераймаць. Нам патрэбна раскашэліцца на нармальную сучасную зброю, патроны. Вінтоўка і патрон сёння падбіраюцца пад кожнага спартсмена. А ў нас дзеці трэніруюцца з савецкімі патронамі, якія страляюць праз раз. Адзін выстраліў, другі — даў асечку. А ад тых жа патронаў залежыць вынік. На турнірах у фіналах барацьба ідзе на дзясятыя часткі балаў. Чым бліжэй пападанне да цэнтра мішэні — тым больш дзясятых. І тут вялікае значэнне мае падбор патронаў. Прывяду прыклад. На Алімпійскіх гульнях у Рыа-дэ-Жанэйра ў стральбе лежачы выступалі наш Віталь Бубновіч і нямецкі спартсмен. Стралялі аднолькава, без дзявятак. Віталь набіраў 10,2 бала, 10,3. А немец — па 10,5, 10,6, 10,7, 10,8. І атрымалася, што стралялі аднолькава, атрымлівалі аднолькавыя балы. Але ў суме ў Віталя атрымалася 102,3, а ў немца — 104,5. А вырашыла ўсё якасць патронаў».

Акрамя зброі і патронаў, стралкам неабходна мноства дапаможных рэчаў — затыльнікі, наплечнікі, «шампіньёны» (накладка на далонь), «шчочкі» (накладка, якая кладзецца паміж шчакой і прыкладам). Стралковы касцюм каштуе каля 2000 еўра, абутак — 300 еўра, намушнікі — каля 150 еўра. У выніку атрымліваецца значная сума.

### ГЛЕДАЧЫ МОГУЦЬ НАШКОДЗІЦЬ, АЛЕ ІХ ПАДТРЫМКА НЕАБХОДНАЯ

Нягледзячы на багатую медалёвую гісторыю, сучасны стралковы спорт вялікай папулярнасцю ў аматараў не карыстаецца. Ігар Басінскі тлумачыць гэта дзвюма прычынамі. Першая — невялікая ўвага сродкаў масавай інфармацыі. Але пасля II Еўрапейскіх гульняў гэта пачало пацыху выпраўляцца. Другая прычына хаваецца ў тым, што стралковы спорт не самы відовішчны. Паколькі стралковы спорт патрабуе сур'ёзнай канцэнтрацыі, якую вялікая колькасць гледачоў на трыбунах можа парушыць, пытанне аб тым, ці патрэбныя балельшчыкі на трыбунах, застаецца рытарычным. Але дакладна вядома, што беларускім перспектыўным стралкам Марыі Мартынавай, Юрыю Шчарбацэвічу, Ілью Чыргейку, Уладзіславе Пронцы, Віталю Бубновічу, Абулу-Азізу Курдзі неабходна адчуваць веру і падтрымку заўзятараў і сваёй краіны, якую яны прадстаўляюць.

# ІРЫНА КУРАЧКІНА — ЧЭМПІЁНКА ЕЎРОПЫ

## Важныя спартыўныя навіны апошніх дзён

1. Падчас першага Нацыянальнага форуму атлетаў адбыліся выбары новага саставу камісіі спартсменаў НАК Беларусі. У камісію ўвайшлі алімпійскі чэмпіён па веславанні на каноэ Аляксандр Багдановіч, прызёр чэмпіянатаў свету і Еўропы па мастацкай гімнастыцы Кацярына Галкіна, беларускі хакеіст, памочнік галоўнага трэнера ХК «Дынама-Мінск» Міхаіл Грабоўскі, старшы трэнер нацыянальнай каманды па акадэмічным веславанні, першая двухразовая алімпійская чэмпіёнка ў гісторыі Рэспублікі Беларусь Кацярына Карстэн, алімпійскі чэмпіён па тэнісе Максім Мірны, алімпійская чэмпіёнка ў лыжнай акрабатыцы (фрыстайл) Ала Цупер.

З 20 прэтэндэнтаў на форуме выбралі шэсць, а яшчэ чатыры будуць названыя паводле выканкама НАК, пасля чаго новы састаў камісіі прагаласуе за кандыдатуру старшыні.

2. У Варшаве прайшоў чэмпіянат Еўропы па барацьбе. На кантынентальным першынстве беларуская каманда заваявала сем медалёў. Ірына Курачкіна (57 кг) заваявала «золата» турніру. Сярэбранымі прызёрамі сталі прадстаўнікі грэка-рымскага стылю Кірыл Маскевіч (87 кг) і Радзік Кулиеў (82 кг). Бронзавыя медалі ў актыве Алі Шабанава (86 кг) і Хаджы Раджабава (92 кг), а таксама Веранікі Івановай (62 кг) і Мікалая Стадуба (97 кг).




Сёння беларускія барцы маюць сем ліцэнзій для ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях у Токіа. Наступным важным стартам для спартсменаў стане сусветны алімпійскі адборачны турнір, які пройдзе з 6 да 9 мая ў Балгарыі. На гэтых спаборніцтвах беларусы выступяць у шасці вагавых катэгорыях у вольнай барацьбе, а ў жаночай і грэка-рымскай — у пяці.

3. Беларускія баксёры выйгралі чатыры ўзнагароды на міжнародным турніры «Кубак губернатара Санкт-Пецярбурга — 2021». Самае паспяховае выступленне паказаў прадстаўнік Гомельскай вобласці Уладзіслаў Смяглікаў (91 кг), які заваяваў «серабро». У гэтай жа катэгорыі бронзавым прызёрам стаў яшчэ адзін беларус Уладзіслаў Брадзецкі. У катэгорыі 63 кілаграмы «бронзу» заваяваў Дзмітрый Асанаў. Сярод баксёраў вагой 75 кілаграмаў бронзавым прызёрам стаў Віталь Бандарэнка.

4. Правы крайні гандбольнай зборнай Беларусі Мікіта Вайлупаў уваходзіць у тройку найлепшых снайпераў адборачнага турніру чэмпіянату Еўропы 2022 года. У трох праведзеных паядынках 6-й кваліфікацыйнай групы Мікіта Вайлупаў закінуў 30 мячоў: 14 разоў у вароты Латвіі (39:27), 11 — у італьянскія вароты (37:32) і 5 — у вароты нарвежскай каманды (33:25). Больш за беларуса закінулі толькі Кай Сміт (Нідэрланды) і Андзі Шмід (Швейцарыя), у якіх па 35 дакладных кідкоў.

5. Беларускія плыўцы разыгралі медалі чэмпіянату краіны і ўстанавілі шэраг рэкордаў. Ангеліна Малашчанка двойчы ўстанавіла юніёрскі рэкорд Беларусі на дыстанцыі 50 метраў брасам. У папярэднім заплыве спартсменка прыплыла да фінішу за 31,86 секунды, а ў фінальным — за 31,85 секунды. Іван Буевіч абнавіў юніёрскі рэкорд на дыстанцыі 50 метраў на спіне — 25,52 секунды. Алеся Акінчыц на дыстанцыі 1500 метраў вольным стылем абнавіла ўласны юніёрскі рэкорд — 17.11,54 секунды, а пасля ўстанавіла рэкорд на дыстанцыі 800 метраў вольным стылем (8.53,16 секунды). Жаночы квартэт у складзе Настассі Куляшовай, Аліны Змушкі, Настассі Шкурдай і Настассі Каракоўскай аднавіў рэкорд у камбінаванай эстафеце на дыстанцыі 4х100 метраў — 4.03,61.

На чэмпіянаце Беларусі спартсмены выканалі нарматывы для ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях у Токіа. Аліна Змушка на дыстанцыі 100 метраў брасам абнавіла нацыянальны рэкорд (1.07,01 секунды) і заваявала ліцэнзію на Гульні. Сваю другую пуцёўку ў алімпійскі Токіа заваявала і Настасся Шкурдай: на дыстанцыі 100 метраў на спіне яна паказала найлепшы вынік.

**Матэрыялы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**

# РУП «Торговый дом «Восточный»

## извещает о проведении 27.05.2021 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 644/С-11461 общей площадью 11,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, аг. Октябрь, ул. Колхозная, 54. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625083009101000170 площадью 0,2500 га.
**Начальная цена продажи – 1 080,00 бел. рублей, размер задатка – 108,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 2.** Машино-место № 125.1 с инвентарным номером 500/D-708120442 общей площадью 13,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-327. Назначение: машино-место; наименование: машино-место.
**Начальная цена продажи – 11 491,20 бел. рублей, задаток – 1 149,12 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 3.** Машино-место № 125.2 с инвентарным номером 500/D-708120443 общей площадью 26,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-328. Назначение: машино-место; наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 13 219,20 бел. рублей, задаток 1 321,92 бел. рубля . Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 4.** Машино-место № 127.1 с инвентарным номером 500/D-708120445 общей площадью 30,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-331. Назначение: машино-место; наименование: машино-место.
**Начальная цена продажи – 13 651,20 бел. рубля, задаток – 1 365,12 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 5.** Машино-место № 128.2 с инвентарным номером 500/D-708120448 общей площадью 13,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-334. Назначение: машино-место; наименование: машино-место.
**Начальная цена продажи – 11 404,80 бел. рубля, задаток – 1 140,48 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 6.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-699925 общей площадью 455,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Максима Богдановича, 78, пом.1Н. Назначение: помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения; наименование: помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения.
**Начальная цена продажи – 552 096,00 бел. рублей, задаток – 55 209,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 7.** Единый объект недвижимого имущества: капитальное строение с инвентарным номером 333/С-53082 общей площадью 551,1 кв. м, назначение: здание блока гаражей, наименование: одноэтажное кирпичное здание, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 322350100001000159 площадью 10,8010 га (право постоянного пользования 26/27), по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Советская, 4/2.
**Начальная цена продажи – 84 499,20 бел. рубля, задаток – 8 449,92 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 602/С-30634 общей площадью 1 643,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Ф. Энгельса, д. 4. Назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения; наименование: производственная база. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624450100001002436 общей площадью 5,6914 га.
**Начальная цена продажи – 260 928,00 бел. рублей, задаток – 26 092,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 9.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816269 общей площадью 15,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-135. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 39).
**Начальная цена продажи – 17 730,00 бел. рублей, задаток – 1 773,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 10.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816272 общей площадью 14,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-119. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 42). **Начальная цена продажи – 17 280,00 бел. рублей, задаток – 1 728,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 11.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816271 общей площадью 14,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-118. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 43). **Начальная цена продажи – 17 010,00 бел. рублей, задаток – 1 701,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 12.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816270 общей площадью 15,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-117. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 44). **Начальная цена продажи – 17 910,00 бел. рублей, задаток – 1 791,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 13.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816274 общей площадью 15,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-115. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 46). **Начальная цена продажи – 17 460,00 бел. рублей, задаток – 1 746,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 14.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816273 общей площадью 14,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-114. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 47). **Начальная цена продажи – 17 280,00 бел. рублей, задаток – 1 728,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 15.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816275 общей площадью 16,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-112. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 49). **Начальная цена продажи – 18 360,00 бел. рублей, задаток – 1 836,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 16.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816276 общей площадью 14,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-198. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 56). **Начальная цена продажи – 13 140,00 бел. рублей, задаток – 1 314,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 17.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816277 общей площадью 14,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-201. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 59). **Начальная цена продажи – 13 230,00 бел. рублей, задаток – 1 323,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**
**Лот № 18.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816278 общей площадью 15,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-205. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 63). **Начальная цена продажи – 13 770,00 бел. рублей, задаток – 1  377,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

| УСЛОВИЯ |
|---|
| 1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.<br>2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.<br>3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость» |

**Аукцион состоится 27.05.2021 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.**

Заявления на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений – 24.05.2021 в 15.00.

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет BY07 MMBN 3012 0000 0101 0165 3934, БИК MMBN BY22, в ОАО «Банк Дабрабыт», г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 27 мая 2021 года.

Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 17 378 87 03; +375 44 763 62 63**

# Открытый аукцион № 12/21
## по продаже офисного и складского помещений по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, д. 11а

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс +375 (17) 256-61-35 |

**Аукцион состоится 31.05.2021 в 11.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701.** Продавец – ООО «ЛИКВА».

| № лота | Предмет аукциона | Местонахождение | Начальная цена продажи лота, USD* с учетом НДС | Сумма задатка по лоту, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-716746, площадь – 207,6 кв. м, назначение – Производственное помещение, наименование – Помещение № 7 | г. Минск, ул. Радиальная, д. 11а, пом. 7 | **41 520** | 2 500 руб. |
| 2 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-704723, площадь – 57,2 кв. м, назначение – Административное помещение, наименование – Помещение № 10 | г. Минск, ул. Радиальная, д. 11а, пом. 10 | **28 600** | 2 000 руб. |

**** расчеты за приобретаемое имущество производятся в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату заключения договора купли-продажи***

| | |
|---|---|
| Порядок проведения и выбора победителя | Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере 5 процентов от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия |
| Прием заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 26.05.2021 до 17.00** |
| Задаток | Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты:<br>- для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;<br>- для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22. Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068.<br>Назначение платежа: «Задаток согласно Извещению о проведении аукциона № 12/21» |
| Затраты | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляются победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 12/21. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения |

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.
Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

**КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА:**
**+ 375 (17) 256-61-35, + 375 (25) 549-86-22 Игорь Садливский, auction@expertiza.by**
**Более подробную информацию и фото по объекту возможно увидеть, посетив страницу http://www.expertiza.by**

**ИНФОРМАЦИЯ**
**об ОАО «Трест Шахтоспецстрой» и его деятельности**
по состоянию на 01 января 2021 г.
4. Доля государства в уставном фонде

| Вид собственности | Количество акций, штук | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| Доля государства в уставном фонде, всего в том числе: | Х | |
| Республиканская | | |
| Коммунальная – всего в том числе: | | |
| областная | | |
| районная | | |
| городская | | |
| 5. Количество акционеров – всего в том числе: | 622 | |
| юридических лиц | 1 | |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | | |
| физических лиц | 621 | |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | | |

6. Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателя | Единица измерения | На отчетную дату | На аналогичную дату прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 2420,36 | 2208,58 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 2420,36 | 2208,58 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 16 | 14,6 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) | Х | Х | Х |
| типа _______ | рублей | | |
| типа_______ | рублей | | |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 16 | 14,6 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) | Х | Х | Х |
| типа _______ | рублей | | |
| типа_______ | рублей | | |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | 2019 | Х |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 19.03.2020 | Х |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | май-декабрь 2020 | Х |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 847,43 | 770,05 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего в том числе: | штук | | |
| поступившие в распоряжение общества: | Х | Х | Х |

| дата зачисления акций на счет «депо» общества | количество акций | штук | срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества | |
|---|---|---|---|---|
| | | Х | | |
| | | Х | | |
| | | Х | | |
| приобретенные в целях сокращения общего количества акций: | | Х | Х | Х |
| дата зачисления акций на счет «депо» общества | количество акций | штук | | Х |
| | | Х | | Х |
| | | Х | | Х |

7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:

| Наименование показателя | Единица измерения | На отчетную дату | На аналогичную дату прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 215061 | 217853 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 172721 | 174689 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) в том числе: | тысяч рублей | 24402 | 21400 |
| прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 42340 | 43164 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -20530 | -17297 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | 2592 | -4467 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | 5525 | 5988 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | 18877 | 15412 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | 137942 | 122488 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 610 | 747 |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | | 6573 |

| | | |
|---|---|---|
| 8. Среднесписочная численность работающих (человек) | 2153 | |
| 9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20 и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): | Наименование вида продукции (вида деятельности) | Процентное соотношение к общей выручке, в % (не менее 20 %) |
| | строительство | 23,5 |
| | строительство шахт | 76,5 |

| | |
|---|---|
| 10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2020 год | 25.03.2021 |
| Дата подготовки аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности: | 24.03.2021 |
| Наименование аудиторской организации (фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) индивидуального предпринимателя), местонахождение (место жительства), дата государственной регистрации, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: | |
| Общество с ограниченной ответственностью «ЮЭйчУай БизнесКоллегия», место нахождения: 220068, г. Минск, ул. Некрасова, 114, помещение 31, комната 2;зарегистрирвано Минским горисполкомом 6 февраля 2013 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191922779 | |
| Период, за который проводился аудит: | |
| 2020 год | |
| Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности - сведения о данных нарушениях: | |
| Годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Трест Шахтоспецстрой» по состоянию на 31 декабря 2020 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь | |
| Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме: | |
| ЕПФР | 15.04.2021 |
| Собственный сайт | |
| Сайт Центрального депозитария ценных бумаг | |
| 13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): применяется с 2007 | |
| 14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет: | |
| shahta.by | |

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Минскагротранс», г. Минск, ул. Бабушкина, д. 29** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: производственно-складская база, расположенная по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 12. Состав лота:**

**Административное здание с пристройкой**, инв. № 640/С-25825, общ. пл. 1035,3 кв. м. **Здание культурно-бытовое**, инв. № 640/С-25834, общ. пл. 370,2 кв. м. **Здание ОГМ**, инв. № 640/С-25839, общ. пл. 416,1 кв. м. **Мойка**, инв. № 640/С-25827, общ. пл. 48,4 кв. м. **Кузница, склад**, инв. № 640/С-25823, общ. пл. 443 кв. м. **Ремонтная мастерская,** инв. № 640/С-25832, общ. пл. 1220,4 кв. м. **Ремонтная мастерская**, инв. № 640/С-25836, общ. пл. 1369,6 кв. м. **Узел управления**, инв. № 640/С-25841, общ. пл. 68,3 кв. м. **Пропускной пункт**, инв. № 640/С-110286, общ. пл. 82,8 кв. м. **Наружные тепловые сети,** инв. № 640/С-110284, общ. пл. 0 кв. м. **Элементы благоустройства**, инв. № 640/С-110291, общ. пл. 2119,1 кв. м. **Автозаправочная**, инв. № 640/С-25838, общ. пл. 62,3 кв. м. **Железобетонная эстакада с очистными сооружениями**, инв. № 640/С-110285, общ. пл. 84,8 кв. м. **Ливневая канализация**, инв. № 640/С-110288, общ. пл. 0 кв. м. **Металлическая эстакада для сварочных работ 2 ед.**, инв. № 640/С-110287, общ. пл. 132,2 кв. м

**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве аренды по 13.09.2066 для содержания и обслуживания зданий и сооружений автомобильного транспорта, общ. пл. 4,1160 га

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 994 558,88 бел. руб.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

